№ 28 (673) 28 ліпеня 2010 www.nn.by

незалежная газета

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Заснаваная ў лістападзе 1906. Адноўленая ў маі 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у серады



**Навумава «сватаюць» у супернікі Лукашэнкі**

Старонка 2



**Скокі са смерцю**

Старонка 7



**Рэпартаж з неаліту**

Старонка 12

## У НУМАРЫ

**«Геніюш — за Беларусь! Як мы можам быць супраць?»**

Чаму ў Ваўкавыску міліцыя сканфіскавала шыльду ў гонар Ларысы Геніюш. **Старонка 8.**

**Сіла нацыі, вымераная Вікіпедыяй**

Інтэрнэт-энцыклапедыя налічвае звыш 25 тысяч беларускамоўных артыкулаў. Украінцы маюць 217 тысяч, літоўцы — 111. **Старонка 7.**

**Поле цудаў**

На мінскай барахолцы можна купіць і кулямётную стужку, і порна, і бел-чырвона-белыя кукарды. **Старонка 11.**

**«Я перажыву Піначэта з прынцыпу»**

Каб нелегальна вярнуцца ў Чылі, Карвалан змяніў твар з дапамогай пластычнай аперацыі. **Старонка 5.**

**Патрабуюцца прадаўцы**

з досведам працы ў прадуктовыя крамы ў г.Мінск, в.Наваселле, в.Пяцеўшчына.

Заробак ад 700 тыс. руб. да 1,0 млн руб.

Т.: (029) 699 96 70, (017) 216 04 45.

ТУРЫСТЫЧНАЕ АГЕНЦТВА
**«ГІСТОРЫЯ-ТУР»**

- **Тур на фестываль «Гальшанскі замак», 21.08.2010** (папярэдні продаж квіткоў і арганізаваная дастаўка транспартам)
- **Аўтобусныя экскурсіі па Беларусі**
- **Адпачынак у Еўропе і на моры**
- **Карпаратыўны адпачынак у шляхецкім фальварку Карчэўскіх, што ў Бянюнах**
- **Шэнгенскія візы**

(029) 677 00 46 www.h-t.by

# Клуб багацеяў Дзмітрыя Лукашэнкі



**У праекце «Нотынгем» нагадвае Версаль.**

«Некамерцыйны» Прэзідэнцкі спартыўны клуб будуе жылы раён і кантралюе латарэі. І траціць больш за $2,5 мільёны на дабрачыннасць.

На тое, што Прэзідэнцкі спартыўны клуб — фактычна прыватная лавачка, намякае тэрмін праўдзення агульнай сустрэчы. Згодна са статутам, кіраўніцтву дастаткова раіцца з іншымі ўдзельнікамі аб'яднання па інтарэсах раз на пяць гадоў. Першая сустрэча адбылася нават трохі пазней ад часу заснавання. На ёй была выбудаваная іерархія арганізацыі. Кіраўніком выбралі сярэдняга прэзідэнцкага сына Дзмітрыя Лукашэнку, а ў ЦК трапілі старэйшы сын Віктар, уплывовы бізнэсовец Юрый Чыж, старшыня Мінскага гарвыканкама Мікалай Ладуцька і яшчэ шэсць былых спартоўцаў і функцыянераў.

**Працяг на старонцы 4.**

«Наша Ніва» з'яўляецца ў кіёсках у Мінску ў сераду ад абеду, у рэгіёнах — у чацвер. На газету можна і падпісацца — глядзі **старонку 2**.




# З новым лордам!

Лукашэнка зноў занепакоены іміджам. Паляпшаць яго паклікалі новага брытанскага піяршчыка, лорда Пітэра Сэлвіна Гамера Чадлінгтана.

Здаецца, што недзе мы гэта ўжо бачылі. У жніўні 2008 на працу ў Беларусь з Вялікабрытаніі быў запрошаны лорд Цімаці Бэл, які раней паляпшаў імідж Маргарэт Тэтчэр і Барыса Беразоўскага.

Бэл адразу паабяцаў, што ў хуткім часе на волю выйдуць усе палітвязні, і слова стрымаў. Наступнай задачай брытанца было дабіцца прызнання міжнароднай супольнасцю вынікаў парламенцкіх выбараў, але тут выйшла загвоздка. Выбары прайшлі з фальсіфікацыямі, таму АБСЕ не прызнала іх легітымнасць.

«Тады лорд Бэл паабяцаў Аляксандру Лукашэнку: «Я табе натоўп заходніх журналістаў прышлю, каб засвяцціцца ў самых уплывовых газетах». І сапраўды: у Мінск на інтэрв'ю з Лукашэнкам прыехаў карэспандэнт Financial Times. Але артыкул выйшаў пад загалоўкам «Апошні дыктатар Еўропы паміж Усходам і Захадам». І напісана там было ўсё тое ж, што пісалі іншыя заходнія журналісты, з лордам Бэлам зусім не знаёмыя. І амаль тое ж, што нядаўна паказвалі па НТВ у фільме «Хросны бацька», — піша журналістка Ірына Халіп.

Лорд Бэл прызнаваўся, што атрымліваў у Беларусі мільёны, але нікому так і не стала вядома, па якім артыкуле дзяржбюджэту праходзілі гэтыя выдаткі. Працай Бэла Лукашэнка, трэба меркаваць, застаўся незадаволены, бо кантракт на наступны год працягнуты не быў без тлумачэння прычынаў.

Без піяршчыка Лукашэнка заставаўся толькі год.

**Працяг на старонцы 8.**

# Навумава «сватаюць» у суперніке Лукашэнкі

**«Адзін адказны работнік Глыбоцкага райвыканкама шапнуў мне на вушка, што прарасійскім кандыдатам на выбарах будзе Уладзімір Навумаў».**

Такі допіс прыйшоў на сайт nn.by.

Гэтыя чуткі цыркулююць не толькі сярод палітычна заангажаваных людзей, але і між тых, хто пра палітыку гаворыць толькі на кухні.

Паўгода таму былы міністр унутраных справаў Уладзімір Навумаў з'ехаў у Маскву. Там генерал-лейтэнант Навумаў уладкаваўся на пасаду дарадцы генеральнага дырэктара дзяржаўнай карпарацыі «Растэхналогіі» Сяргея Чэмезава. Гэтая структура знаходзіцца пад асабістым кантролем Уладзіміра Пуціна.

Пасля гэтага ў Мінску Навумава ніхто не бачыў, хоць сам ён кажа, што рэгулярна прыязджае. Паводле непацверджанай інфармацыі, супраць яго была заведзеная крымінальная справа. Таму пры першым перасячэнні мяжы экс-міністр можа апынуцца ў «амерыканцы».


PHOTO.BYMEDIA.NET

Уладзімір Навумаў не можа быць кандыдатам у прэзідэнты хоць бы з той прычыны, што ён ураджэнец Смаленска. Паводле беларускага заканадаўства, чалавек, які нарадзіўся за межамі нашай краіны, не можа заняць найвышэйшую пасаду. Раней на гэтым апёкся комік Крыжаноўскі ў 2001.

**Навумаў не можа быць кандыдатам у прэзідэнты, бо ён ураджэнец Смаленска.**

Па-другое, выбар Навумава таксама досыць дзіўны. Наўрад ці беларусы будуць масава галасаваць за адыёзнага міліцэйскага начальніка, з якога ўсё яшчэ не знятыя падазрэнні ў гучных знікненнях апанентаў улады.

Выглядае на тое, што запускаць чуткі пра прарасійскага кандыдата Навумава могуць спецслужбы. Тут і асабістае звядзенне рахункаў (КДБ і МУС пры Навумаву жорстка супернічалі), і збіванне праціўнікаў Лукашэнкі з панталыку, каб яны спадзяваліся «на дзядзьку».

**Зміцер Панкавец**

# Майкі бяспечныя і небяспечныя

**«За Беларусь без Лукашэнкі» — такі надпіс на майцы стаў прычынай затрымання гомельскага актывіста АГП Уладзіміра Няпомняшчых.**

Яго справай займаецца капітан міліцыі У. Шукель. Што канкрэтна парушыў чалавек? На гэтае пытанне, мусіць, цяжка адказаць і самім міліцыянтам, нацкаваным на любую публічную праяву нязгоды з аўтарытарным рэжымам.

Выпадак стаў нагодай высветліць, якім надпісам на майках аддаюць перавагу беларусы.

## «П'ю, куру, лаюся матам»

У гандлёвым цэнтры «Пасаж», што на Нямізе, вывешаныя ўзоры прадукцыі кампаніі maika.by. Самая пашыраная тэма надпісаў — п'янства. «Падчас пажару мяне выносяць першым», «Beer or not to beer», «П'ю, куру, лаюся матам». І як тут будзеш вінаваціць «Майку.бай» — фірма прадае тое, што карыстаецца попытам. Корань праблемы ў тым, што пабытавае п'янства не лічыцца заганным сярод моладзі.

У офісе кампаніі maika.by тлумачаць, што апошнім часам большасць замоваў на майкі з надпісамі ідзе ад кампаній: «Замаўляюць свае лагатыпы. Гэта ж таксама рэклама». Паглядзець на прадукцыю, якой займаецца фірма, калі гаворка ідзе не пра замовы ад кампаній, можна тамсама. Апроч алкагольнай папулярная сэксуальная тэматыка, накшталт «Sex, Труд, Май».

## Тутэйшы бульбяны жук і Пагоня

Месца, дзе можна купіць «незвычайную» майку, якая пры гэтым не будзе мець дачынення да пабытавага п'янства, — мінская Галерэя сучаснага мастацтва «Ў». Каштуюць яны там нямала — ад 40 да 80 тысяч. Але ёсць з чаго выбраць: і Мона Ліза ў трактары, і кентаўр з чырвона-зялёным сцягам, і «Пагоня» з подпісам «Z яшчэ вернецца».

Асаблівае месца ў фантазіі аўтараў (а рабіла гэтыя майкі дызайнерская кампанія «Адліга») займае каларадскі жук з бел-чырвона-белай спінкай і подпісам: «Я люблю бульбу. Тутэйшы бульбяны жук». Жук фігуруе і на майцы «Каларадская пушча», дзе выконвае ролю зубра. Супрацоўнікі галерэі кажуць, што такія майкі самыя папулярныя.

З'яўляюцца ў Беларусі і майкі еўрапейскага ўзору, кшталту «I Love Minsk» ці «I Love Belarus».

Ва Украіне, дарэчы, цяпер робяцца папулярнымі саколкі з цытатамі паэта Юрыя Андруховіча — іх можна знайсці ў любой львоўскай краме. Таму, можна меркаваць, цытаты з Купалы і Багдановіча, Хадановіча і Вольскага на грудзях — наступны крок беларускіх вытворцаў.

**Юрась Ускоў**




## Самае чытанае на nn.by за 21—27 ліпеня

- Малы беларуска-беларускі слоўнік сэксуальных паняццяў
- «Жорсткая размова» з Андрэем Саннікавым на Бі-бі-сі + відэа
- «Па-сапраўднаму страшны ўжо не Лукашэнка»
- Сумная будучыня сэксу
- Фільм «Хросны бацька» стане серыялам?
- «Ці лёгка дамаўляцца з беларускім кіраўніцтвам? Вельмі лёгка, так лёгка!»
- Беларускі памераюцца грудзьмі
- Рэпартаж з неаліту
- Лукашэнка даручыў міністру адукацыі пачаць працэдуру далучэння Беларусі да Балонскага працэсу
- Бібліятэчка лукашэнказнаўцы

## nn@nn.by

**«Ляпіс Трубяцкой» запісаў песню «Купляй беларускае!»**

Сарцірны гумар — гэтага ад Ляпісаў я не чакаў. Па-першае, песня ўмацоўвае стэрэатып аб тым, што беларуская мова — гэта сродак зносін аўтапаты. Па-другое, курс на здзекванне з лозунгаў тыпу «беларускае — самае маё» ў доўгатэрміновай перспектыве шкодзіць развіццю ўнутранага рынку й стварае загадзя негатыўны імідж таварам і паслугам беларускага малога й сярэдняга бізнэсу.

**katechizis**

## Сцісла

• **Горад-спадарожнік Смалявічы будзе каштаваць $1,76 мільярда.** Такія лічбы падае ўпраўленне горадабудаўніцтва Мінгарвыканкама. Падчас будаўніцтва гарадоў-спадарожнікаў Мінска вёскі зносіцца не будуць.

• **Заробкі бюджэтнікаў узрастуць на трацінy.** Чарговае падвышэнне тарыфнай стаўкі першага разраду плануецца ў Беларусі з 1 лістапада.Стаўку плануецца павысіць да Br118-120 тысяч рублёў. З 1 чэрвеня тарыфная стаўка першага разраду ўстаноўленая ў памеры Br90 тыс.

• **Злавілі хулігана, які абабраў заслаўскі касцёл.** Злачынства было ўчыненае ў 2006. У касцёле Найсвяцейшай Панны Марыі былі сарваныя фіранкі, паламаная мэбля, пабітыя абразы. Знік паўтараметровы падсвечнік. На месцы злачынства былі сляды абутку зламысніка і крыві, адбіткі пальцаў. Праз чатыры гады, дзякуючы генна-тыпаскапічнай экспертызе, выявілі асобу зламысніка. Ім аказаўся 28-гадовы непрацуючы мясцовы жыхар. На пытанне аб матывах такіх дзеянняў зламыснік адказаць не змог.

• **За студзень—чэрвень 2010 у дзяржбюджэт ад рэалізацыі алкаголю і піва паступіла 2,75 трлн рублёў (або $ 916 666 666).** 42% даходаў атрымана ад продажу гарэлкі, яшчэ 30,9% — ад рэалізацыі «чарніла». Даражэйшыя напоі склалі па пары працэнтаў. Паводле Мінздароўя, у 2009 на кожнага грамадзяніна прыпала 8,96 л у пераліку на абсалютны алкаголь. Пагрозай для нацыі лічыцца больш за 5 літраў алкаголю на душу ў год.

• **Рыхтуемся да грымотаў.** 29—30 ліпеня сіноптыкі прагназуюць воблачнае з праясненнямі надвор'е, кароткачасовыя дажджы. У асобных раёнах навальніцы, па ўсходзе магчымы град. Тэмпература паветра днём 18—25°C, па ўсходзе да 28°C. У Мінску 29 ліпеня воблачна з праясненнямі. Кароткачасовы дождж, навальніца. Тэмпература днём 23—25°C.

• **Напалеон Орда ва Уругваі.** У горадзе Сан-Хаўер адкрылася выстава рэпрадукцыяў карцін беларускага мастака. На ёй — 28 мастацкіх вобразаў Беларусі XIX ст. Выстава прысвечаная гадавіне стварэння горада, у развіццё якога зрабілі ўнёсак і выхадцы з Беларусі.


# Не ўсё ў жыцці апошні раз!

## Падпіска праз Рэдакцыю

Цана падпіскі праз Рэдакцыю на месяц складае 7500 рублёў.

Мы рэкамендуем падпісвацца праз Рэдакцыю.

Наша сістэма дастаўкі газеты за 3 гады даказала сваю надзейнасць. Мы зможам дастаўляць Вам газету хутчэй або з той жа хуткасцю, што «Белпошта».

Каб штотыдзень атрымліваць газету, дасылайце адрасы і грошы за газету.

1) Просім усіх ахвотных падпісацца паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз: тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Мінск, а/с 537.

2) Просім у бланку банкаўскага паведамлення ці паштовага пераказу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езда.

**Банкаўскія рэквізіты (змяніліся з 1 мая):**

ПВУП «Суродзічы», УНП 190 786 828

Аддз. № 539 ААТ «Белінвестбанк», вул. Калектарная, 11, Мінск, код 739

Рахунак атрымальніка: 3012 740 628 011

Від аплаты: За газету «Наша Ніва»

## Падпіска праз «Белпошту»

Цана гэтай падпіскі — 8 520 руб. на месяц.

Падпісныя індэксы ў каталогу «Белпошты»: для людзей — 63125, для прадпрыемстваў — 631252. Падпісацца можна на кожнай пошце.

## Дзякуй падпісчыкам,

якія падпісваюцца праз Рэдакцыю

Галіне Ч. з Рэчыцкага раёна.
І.Б. з Оршы.
Віталю Г. з Чачэрскага раёна.
Мікалаю І. з Лунінецкага раёна.
Аляксандру Г. з Кіраўскага раёна.
Уладзіміру Т. з Жлобінскага раёна.
Уладзіміру Я., Галіне Г. з Барысаўскага раёна.
І.В. са Стаўбцоўскага раёна.
Сяргею К., А.Н. з Салігорскага раёна.

# Цяжкая размова Андрэя Саннікава ў праграме «Hardtalk» Бі-бі-сі

Будучы кандыдат у прэзідэнты Беларусі Андрэй Саннікаў на мінулым тыдні стаў госцем папулярнай тэлеперадачы «HARDtalk» («Жорсткая размова») на канале Бі–бі–сі.


Юлія Дарашкевіч

Ніхто з беларусаў дагэтуль не ўдзельнічаў у гэтым рэйтынгавым ток-шоу. Перадача, якая з'яўляецца ў эфіры ад 1997, выходзіць чатыры разы на тыдзень. Героямі праграмы былі самыя розныя людзі — ад дзеячаў культуры да прэзідэнтаў. Вядзе шоу Стывен Сакур, да гэтага доўгі час ён быў карэспандэнтам тэлеканала ў ЗША і Брусэлі.

Характэрная асаблівасць гэтай перадачы — вострыя і нязручныя пытанні. Не кожны суразмоўца будзе здольны падлаўчыцца пад манеру вядоўцы. Напрыклад, прэзідэнт Грузіі Саакашвілі так і не падстроіўся, таму заўважна нерваваўся. Далёка не кожны і згодзіцца ўзяць удзел, бо ёсць вялікая рызыка выйсці з яе дурнем.

Саннікаў, які знаходзіўся ў Лондане разам са «Свабодным тэатрам», рызыкнуў пагадзіцца.

Першае, што кінулася беларускім гледачам пры праглядзе інтэрв'ю, — далёка не дасканалая англійская мова Саннікава. Зрэшты, сярод беларускіх палітыкаў адзінкі ўвогуле здольныя вольна весці дыскусію на англійскай мове.

Звярнула на сябе ўвагу, што вядоўца Стывен Сакур рыхтаваўся да перадачы больш, чым Саннікаў. Тэлевізійнік вольна апераваў лічбамі ВУП Беларусі і суседніх краін, цытаваў даследаванні грамадскай думкі.

Калі Саннікаў успомніў пра штомесячныя акцыі салідарнасці са зніклымі палітыкамі, то вядоўца адразу парыраваў, што на іх выходзіць усяго некалькі дзясяткаў чалавек. Саннікаў не знайшоў нічога лепшага, як прапанаваць Сакуру пажыць у Беларусі, каб зразумець, чым рызыкуюць гэтыя людзі.

Саннікаў мяркуе, што за апошнія гады беларускі рэжым не стаў больш ліберальным, «была спроба зрабіць выгляд, што сістэма можа змяніцца».

«Так, ёсць «Хартыя-97». Мы не зарэгістраваныя і ніколі не будзем зарэгістраваныя. У Беларусі арганізацыю зарэгістраваць немагчыма». — «Але вас ніхто не закрыў». — «Нас не існуе! Нас немагчыма закрыць, бо нас няма».

«Я не думаю, што знаходжуся ў бяспецы. Дакладней, я не проста думаю — я знаю, што жыць у Беларусі і быць у апазіцыі небяспечна. Але мы працягнем барацьбу», — казаў госць эфіру.

Саннікаў у чарговы раз пацвердзіў, што збіраецца балатавацца на прэзідэнцкіх выбарах. «Так, мы будзем удзельнічаць у прэзідэнцкіх выбарах, але ў нас не будзе доступу да найбольш эфектыўных СМІ, такіх як тэлебачанне, FM-радыёстанцыі і дзяржаўная прэса з яе гіганцкімі накладамі. І мы ведаем, што нам не дазволяць быць у складзе камісій, якія вядуць падлік галасоў». Палітык адкінуў абвінавачванні, што ён будзе няздольны сабраць 100 тысяч подпісаў.

Калі вядоўца даводзіў, што Лукашэнка — самы папулярны палітык у Беларусі, то Саннікаў адказаў, што Брэжнеў таксама быў самым папулярным палітыкам у СССР, але што тое значыла.

Былы дыпламат назваў беларускую стабільнасць нікчэмнай, а ВУП прапанаваў параўноўваць не з Грузіяй і Малдовай, а з Літвой і Польшчай.

«Я думаю, што Расія, мякка кажучы, расчаравалася ў Лукашэнку, бо ён не выконвае сваіх абяцанняў. Я думаю, тое, як ён іх падманваў на працягу доўгага часу, прывяло да сапраўднай вайны з Крамлём. Я гаварыў заўсёды: наша стратэгічная мэта — гэта Еўрапейскі саюз, а нашым стратэгічным партнёрам заўсёды будзе Расія», — сказаў Саннікаў пра адносіны з усходнім суседам.

«Я хацеў бы, каб Масква расплюшчыла вочы і зразумела, што яны нічога не атрымалі ад падтрымкі гэтага рэжыму і што гэты рэжым па-сапраўднаму перашкаджае развіццю ўсяго рэгіёна, уключаючы Расію, бо ў іх таксама няма пэўнасці ў дачыненні транзіту іх газу і нафты», — сказаў Саннікаў.

«Я не настолькі наіўны, каб разлічваць на сумленныя выбары, і менавіта таму я рады, што апазіцыя прыйшла да кансэнсусу аб тым, што вулічная пратэсту нам не пазбегнуць», — лічыць каардынатар «Еўрапейскай Беларусі».

«Я спадзяюся на вызваленне ў наступным годзе, а праз 5-6 гадоў мы будзем гатовыя ўступіць у ЕС», — скончыў размову палітык.

У цэлым Саннікаў выглядаў у HARDtalk годна. Пытанні вядоўцы так і не паставілі яго ў тупік. Перад пачаткам прэзідэнцкай кампаніі можна канстатаваць, што Андрэй Саннікаў мае найлепшыя сувязі і піяр, Уладзімір Някляеў — фінансавы рэсурс, Аляксандр Мілінкевіч — пазнавальнасць і рэйтынг.

**Зміцер Панкавец**

# «Ці лёгка дамаўляцца з беларускім кіраўніцтвам? Вельмі лёгка, так лёгка!»

Прэм'ер–міністр Расіі Уладзімір Пуцін іранізаваў пра адносіны з Беларуссю.

«Я не бачу ніякай інфармацыйнай вайны, — заявіў Пуцін расійскім журналістам пасля сваіх перамоваў з прэзідэнтам Украіны Віктарам Януковічам у яго рэзідэнцыі ў Крыме. — Я мала чытаю перыёдыкі, мала гляджу падобнага роду электронныя прэсы ў штодзённым рэжыме».

На думку прэм'ера, «найлепшая рэакцыя на такія матэрыялы ў выпадку, калі хтосьці лічыць, што яны несправядлівыя, — адказваць таксама ў інфармацыйнай прасторы».

«Ці лёгка дамаўляцца з беларускім кіраўніцтвам? Вельмі лёгка, так лёгка! — пад'ялдыкнуў Пуцін. — Калі гаворка ідзе пра грошы, аб'ёмы паставак энергарэсурсаў, усім хочацца атрымаць штосьці на дурніцу ад Расіі, а калі не ўдаецца, узнікае раздражненне».

«У той жа час, мы павінны ўлічваць законныя інтарэсы нашых партнёраў, — падкрэсліў прэм'ер-міністр Расіі. — Я мяркую, што мы так і робім: мы ж дамовіліся з беларускімі калегамі, падпісалі кантракт у 2007, і мы не просім нічога залішняга за рамкамі гэтага кантракту, мы просім толькі выконваць падпісаныя намі дамоўленасці, больш нічога не трэба».

«Усе хочуць купіць танней, а прадаць даражэй, гэта звычайная справа, тут няма чаго нагнятаць. Але калі падпісаная дамова, то яе трэба выконваць», — заключыў ён.

Тым часам стала вядома, што расійскія тэлежурналісты падрыхтавалі яшчэ два фільмы пра Лукашэнку. Яны стануць працягам нашумелай дылогіі «Хросны бацька», якая выйшла на НТВ. Калі чакаць новых твораў, яшчэ невядома.

**ЗП**

## Сцісла



**Башар Асад прыйшоў да ўлады як сын папярэдняга дыктатара, Хафэза Асада. Фота зробленае ў часе візіту Лукашэнкі ў Дамаск.**

• **Башар Асад у Мінску.** Беларусь з афіцыйным візітам наведаў прэзідэнт Сірыі Башар Асад. «Беларусь і Сірыя могуць значна рушыць наперад у палітычнай і гандлёва-эканамічнай сферах», — лічыць А.Лукашэнка. Канкрэтыка перамоваў не разгалошвалася. Сірыя ў мінулым закупляла зброю савецкіх і расійскіх узораў. Гэтая краіна застаецца ў стане вайны з Ізраілем. Лукашэнка на камеры заявіў аб гатоўнасці размясціць у Беларусі сірыйскую фармацэўтычную вытворчасць, а ў Сірыі наладзіць зборку трактароў.

• **Мілінкевіч спадзяецца сабраць 5-6 тысяч чалавек у групу падтрымкі.** «Мы правядзем тры этапы фармавання ініцыятыўнай групы. Першы ўжо фактычна завяршаецца. На другім этапе мы будзем працаваць над стварэннем выбарчага блоку. Трэці этап — выход на шырокія колы грамадства», — кажа намеснік Мілінкевіча Юрась Губарэвіч.

• **Лідэр БНФ: Нацыянал-дэмакратам на выбарах трэба разлічваць толькі на сябе.** «У сённяшняй сітуацыі мы вымушаныя змагацца на два франты — супраць Лукашэнкі і магчымага прарасійскага кандыдата», — падкрэсліў Аляксей Янукевіч.

• **Алег Сурган выйшаў на волю.** 27 ліпеня з калоніі горада Глыбокае быў вызвалены палітвязень, актывіст руху «Маладая Беларусь» Алег Сурган. Мужчына адбываў паўгадавы арышт. Яго звінавацілі ў нападзе на супрацоўніка міліцыі падчас арышту. Тое здарылася ў часе вывешвання ў Віцебску бел-чырвона-белага сцяга.

**ЗП**

# Алег Трусаў: Я супраць, каб гэтая ўлада выкарыстоўвала наш сцяг

Старшыня Таварыства беларускай мовы мяркуе, што за пяць гадоў беларусы будуць ужо з новым прэзідэнтам.

«Дваццаць гадоў таму мы прынялі Дэкларацыю аб незалежнасці. У гісторыкаў ёсць такі часавы адрэзак, як дваццаць пяць гадоў. Гісторыя часта нагадвае парабалу. Сёння Лукашэнка гаворыць тое, што 20 гадоў таму казаў Пазняк, нават у нечым яго пераўзышоў. Праз пяць гадоў, я думаю, мы ўжо будзем пры новай уладзе, якая верне Пагоню і бел-чырвона-белы сцяг. Можа, яшчэ і гэтая ўлада яго абвесціць гістарычнай каштоўнасцю. Зрэшты, я супраць, каб гэтая ўлада выкарыстоўвала нашы сімвалы. Яна прыдумала свае, то хай са сваімі і адыходзіць».

**ЗП**

# Аляксандр Казулін: Перамены не за гарамі

Былы кандыдат на пасаду прэзідэнта і палітвязень узяў удзел у Форуме свабоды ў сталіцы Нарвегіі Осла.

У сталіцу Нарвегіі з'ехаліся вядомыя дысідэнты з усяго свету — лідэр малайзійскай апазіцыі Анвар Ібрагім, уйгурская праваабаронца Рабія Кадыр, суданская журналістка Любна Ахмед аль-Хусэйн, афганец Сіма Самар, расійскі шахматыст Гары Каспараў.

Выступ Казуліна быў найдаўжэйшым. Палітык расказаў пра свой лёс — як ён, былы рэктар БДУ, апынуўся ў апазіцыі, а потым — за кратамі, пра трагічную смерць сваёй жонкі Ірыны.

«Гэты нялюдскі рэжым вядзе Беларусь у тупік, ён ламае лёсы тысяч і тысяч людзей. Мы разам павінныя змагацца з дыктатурай як з анамаліяй і хваробай. Хутка ў Беларусі новыя прэзідэнцкія выбары. Свабодалюбныя беларусы не зміраюцца з апошняй дыктатурай Еўропы, нават калі ў гэтым дзіўным, непрадказальным свеце будуць яе прыхільнікі і мецэнаты. Перамены ў Беларусі не за гарамі», — заявіў Казулін.

**ЗП**

# Клуб багацеяў Дзмітрыя Лукашэнкі

Працяг са старонкі 1.

Але чыя ж гэта лавачка юрыдычна? «Рэспубліканскае дзяржаўна-грамадскае аб'яднанне» — чорт нагу зломіць. Адметна, што на сайце арганізацыі немагчыма знайсці ніводнага фотаздымка хоць кагосьці з кіраўніцтва, апроч самога Аляксандра Лукашэнкі, які фармальна дачынення да клуба не мае.

### Стварылі некамерцыйную арганізацыю, але выйшла нешта не тое…

«Беларускія спартоўцы, ветэраны спорту, трэнеры, кіраўнікі і выкладчыкі спартовых школ у ліпені 2005 аб'ядналіся ў некамерцыйную арганізацыю, каб падтрымаць фізкультурна-аздараўленчы рух у краіне, стварыць неабходныя ўмовы для заняткаў спортам і фізічнай культурай, арганізацыі актыўнага адпачынку», — кажа легенда арганізацыі. Якім бокам тады ў яе трапілі чыноўнікі і калі яна стала камерцыйнай, грамадскасці прасачыць не ўдалося.

Дзмітрый Лукашэнка не стаў хаваць прыблізных фінансавых стратаў арганізацыі — $1,3 мільёна на правядзенне дзіцячых і падлеткавых спартыўных спаборніцтваў. Амаль столькі ж — на стыпендыі 500 атлетам. Тое, што можна назваць фактычна дабрачыннасцю.

Але Прэзідэнцкі спартыўны клуб — установа надзвычай актыўная не толькі ў спартыўным плане, як вынікае з назвы. Апроч абстрактнай прапаганды здаровага ладу жыцця, у яго ёсць і канкрэтныя бізнэс-праекты.

### «Адкуль грошы, Дзіма?»

Прэзідэнцкі сын любіць падкрэсліваць, што ягоная арганізацыя існуе не за кошт бюджэту. Маўляў, даходы — унёскі партнёраў і спонсараў, а таксама прадпрымальніцкая дзейнасць.

Самы амбітны праект, у рэалізацыі якога ўдзельнічае «Клуб» Лукашэнкі-сярэдняга, — $800-мільённы жылы комплекс «Нотынгем». Спецыялісты называюць яго найбуйнейшай будоўляй пасля «Мінск-Сіці» і «Маяка Мінска».

Інвестар і будаўнік — кампанія «Юнівест-М» і яе даччыная прадпрыемства «Юнівестбудінвест». Старт праекту мусіць быць дадзены ў 2010. Непадалёк ад пасёлка Калодзішчы, што на ўсход ад Мінска, на тэрыторыі 290 га пачнуць будаваць звышэлітны малапавярховы пасёлак. Плануецца пабудаваць больш за 850 тысяч квадратных метраў жылля для 21 тысячы чалавек. Да новага раёна пабудуюць новую шырачэзную трасу, якая скрыжуецца з МКАД і стане працягам вуліцы Ваўпшасава.

Як хваліцца архітэктары, для выкарыстання назвы «Нотынгем» спатрэбілася афіцыйнае ўхваленне гарадскога савета аднайменнага англійскага горада, які з'яўляецца пабрацімам Мінска. Хоць шмат каму нагадвае каралеўскі Версаль пад Парыжам.

«Дабро» на будаўніцтва атрымалі і ад Мікалая Ладуцькі. Нагадаем — яшчэ аднаго кіраўніка «Клуба». Калі былы старшыня Мінгарвыканкама Міхаіл Паўлаў не вітаў стварэнне малапавярховых раёнаў, то Ладуцька ставіцца да іх прыязна.

Латарэі кампаніі «Спорт-Пары» — гэта «Спортлато» і «Кена». Дзмітрый Лукашэнка валодае імі разам з кампаніяй аднаго з найбагацейшых беларускіх бізнэсоўцаў Уладзіміра Пефціева «БТ Тэлекамунікацыі». Нягледзячы на шматлікую рэкламу, беларусы слаба адрэагавалі на новыя электронныя гульні.

ЗАТ «Гандлёвы дом «БелАЗ» мае эксклюзіўнае правы на продаж прадукцыі БелАЗа на тэрыторыі Расіі. Няўжо без дапамогі Прэзідэнцкага спартыўнага клуба самазвалы не прадаваліся за ўсходнюю мяжу?

«Першая ўзорная друкарня» — яшчэ адно стварэнне прэзідэнцкага сына. Узяўшы за назву стары расійска-савецкі брэнд — такая друкарня існавала з канца XIX стагоддзя, — Дзмітрый Лукашэнка толькі пачынае раскручваць свой праект. Пры адпаведным лабіяванні кампанія можна хутка выйсці на першыя месцы ў краіне.

Вось так «дзяржаўна-грамадскае» аб'яднанне паціху ператвараецца ў магутную бізнэс-групоўку.

**Віталь Несцераў**




Эмблема арганізацыі.



Дзмітрый Лукашэнка.

Будучы «Нотынгем».



**У аэрапорце? У машыне? У метро? Чытай pda.nn.by з мабільніка**

Трымайце руку на пульсе pda.nn.by, дзе б Вы ні былі. nn.by штодзённа забяспечвае аператыўныя і аб'ектыўныя навіны, ясныя каментары і аналітыку, аўтарскае відэа і фота. Усім гэтым Вы можаце карыстацца з мабільнага тэлефона. Праз ПДА–версію Вы можаце сачыць за навінамі і каментарамі, ашчаджаючы трафік. Яна зручная і сціслая.

# Беларусь чакаюць эканамічны рост і прыватызацыя

Нямецкая эканамічная група сумесна з даследчым цэнтрам Інстытута прыватызацыі і менеджменту прадставіла свае прагнозы макраэканамічных паказчыкаў Беларусі на 2010 год.

### Унутраны попыт паскорыць рост ВУП

Першая выснова, прадстаўленая ў даследаванні, абнадзейвае: у выпадку, калі беларускаму ўраду ў другім паўгоддзі 2010 удасца забяспечыць даступнасць крыніц фінансавання інвестыцый у асноўны капітал, тэмп росту ВУП можа дасягнуць 10,2%.

— Вельмі важны ўнёсак у рост ВУП у 1-м квартале зрабіла спажыванне хатніх гаспадарак, — падкрэслівае кіраўнік Інстытута прыватызацыі і менеджменту Дзмітрый Крук. Праўда, на думку экспертаў, ужо ў 2011 годзе рост ВУП складзе толькі 5,7%.

### Сярэдні заробак у Беларусі складзе $400

На думку экспертаў, ужо ў гэтым годзе праграмы дзяржаўнай і сацыяльнай падтрымкі зробяцца больш жорсткімі, бо фінансавы сектар апынецца пад ціскам пагоршаных умоваў нафтаперапрацоўкі ў Беларусі — а гэта адна з асноўных галін, якія фармуюць бюджэт краіны. Праз мыты на нафту бюджэт Беларусі ў гэтым годзе можа страціць да 2% ад ВУП. У першую чаргу грошы спатрэбяцца, каб забяспечыць абяцаны беларусам заробак у $500 да канца 2010.

— Аднак мы мяркуем, што гэта будуць $400, — адзначае эксперт Глеб Шымановіч.

### Прадпрыемствы і банкі пачнуць прадаваць

У гэтым годзе ўрад пачне актыўна распрадаваць прадпрыемствы і за кошт гэтага палепшыць свае фінансавыя рахункі.

— Мы чакаем, што чысты прыток непасрэдных інвестыцый складзе $2,4 мільярда, — кажа эксперт Ірына Тачыцкая. — Гэта будзе звязана з пагадненнямі па зліцці і паглынанні ў прамысловасці, банкаўскім сектары і сектары паслуг. Урад актывізуецца з продажам прадпрыемстваў, і для гэтага ёсць некалькі магчымасцяў. Напрыклад, ужо выстаўлены на продаж завод па апрацоўцы крышталю ў Гомелі — гэта даволі прывабнае прадпрыемства, таму што такіх заводаў не так шмат у свеце, і яны цэняцца. Вядуцца перамовы наконт «Беларуськалію». Хоць мы дапускаем, што да канца гэтага года продаж можа не адбыцца, плацяжы будуць ісці траншамі.

Па словах Ірыны Тачыцкай, пра свой намер інвеставаць у 2010 у банкаўскую сістэму Беларусі да 8 млрд даляраў заявіў Еўрапейскі банк рэканструкцыі і развіцця.

— Мы не думаем, што гэтая сума можа быць рэалізаваная нават чыста тэхнічна на працягу гэтага году, але рашэнне аб продажы «Белінвестбанка» і магчымай куплі пакета акцый «Белаграпрамбанка» і «Беларусбанка» можа зрабіць істотны ўнёсак у прыток непасрэдных замежных інвестыцый у краіну, лічыць эксперт.

Яшчэ адна магчымасць дзяржавы займець замежную валюту — гэта крэдыты і пазыкі. Беларускія ўлады ўжо робяць сур'ёзныя намаганні для прыцягнення камерцыйных крэдытаў і пазыкаў з Кітая.

— Але ў той жа час хочам звярнуць увагу, — падкрэслівае Ірына Тачыцкая, — што ні ў сцэнарыі гэтага году, ні 2011, мы не разглядаем варыянты працягу супрацоўніцтва Беларусі з МВФ.

### Інфляцыя будзе расці

На думку экспертаў, утрымаць інфляцыю ў Беларусі ў гэтым годзе не атрымаецца. Прычына — актыўная крэдытная падтрымка эканомікі, скіраваная на стымуляванне росту ўнутранага попыту.

— На наш погляд, інфляцыйныя рызыкі на дадзеным этапе даволі вялікія для нацыянальнай эканомікі, — падкрэслівае Дзмітрый Крук. — Цяперашняя эканамічная палітыка можа выявіцца ў сярэднегадавой інфляцыі каля 12% у 2010 і каля 20% у 2011.

### Курс еўра да даляра — 1,3

Незалежныя эксперты мяркуюць, што да канца году Нацбанку ўдасца захаваць кошт беларускага рубля практычна на такім жа ўзроўні, як цяпер. Абменныя курсы будуць наступныя: даляр ЗША — 3150 рублёў, еўра — 4095, расійскі рубель — 105,2. Курс еўра да даляра складзе 1,3.

— У выпадку, калі ўрад зможа прыцягнуць новыя пазыкі і фінансаваць дэфіцыт і ў 2011, мы мяркуем, што абменны курс да даляра ЗША на канец 2011 складзе 3300 беларускіх рублёў, — адзначае Дзмітрый Крук.

**«Заўтра тваёй краіны»**

# Сярэдняя пенсія падрасце на 60 тысяч рублёў…

Ад жніўня прыбаўка складзе 12,5%.

Кіраўнік дзяржавы падпісаў указ, згодна з якім з 1 жніўня пенсіі павялічацца на 12,5%. У выніку памер сярэдняй пенсіі ў жніўні 2010 павялічыцца на 58 600 рублёў і складзе 528,3 тысячы рублёў.

Пакуль што сярэдні памер працоўных пенсій складае 468 000 рублёў, пенсій па ўзросце — 490,5 тысячы, мінімальнай пенсіі па ўзросце — 217,7 тысячы рублёў.

Апошняе павелічэнне было праведзена 1 студзеня 2010. Тады пенсіі былі павышаныя ў сярэднім на 9,1%.

**Колькі атрымліваюць суседзі-пенсіянеры**




# …а новы мэр Мінска абрэзаў дапамогу па доглядзе інвалідаў на тыя ж 60 тысяч

Ранейшыя даплаты, якія ажыццяўляліся з фонду мэра, скасаваныя.

Чытачы «Нашай Нівы», якія атрымліваюць дапамогу па доглядзе інвалідаў I групы ці асобаў, старэйшых за 80 гадоў, былі непрыемна здзіўленыя паменшэннем выплат.

«У мяне бацька — ветэран Вялікай Айчыннай вайны, інвалід I групы па зроку, — расказвае чытач Аляксандр. — Я даглядаю яго, таму да мінулага месяца мы атрымлівалі каля 230 тысяч рублёў. У мінулым месяцы прадстаўніца сабеса прынесла менш, усяго 210 тысяч рублёў, і сказала, што выплаты паменшацца яшчэ раз. Таму цяпер дапамога будзе складаць 170 тысяч рублёў».

З такой жа бядой сутыкнуўся іншы чытач газеты, Павал. Ён даглядаў асобу, старэйшую за 80 гадоў, але лічбы зніжэння выплат аказаліся такімі ж. У раённым органе сацыяльнай абароны насельніцтва яму растлумачылі, што даплата ажыццяўлялася са сродкаў спецыяльнага фонду старшыні Мінскага гарвыканкама. Цяпер, у сувязі з дэфіцытам грошай, новы мэр Мікалай Ладуцька вырашыў скасаваць бонус.

**ЯВ**

# «Я перажыву Пiначэта з прынцыпу»



Памёр Луіс Карвалан.

На 94-м годзе жыцця 21 ліпеня памёр былы генеральны сакратар Кампартыі Чылі Луіс Карвалан. Многіх людзей старэйшага веку ўразіў не столькі факт яго смерці, колькі тое, што ён дагэтуль жыў. З часу, калі яго імя было на першых старонках прэсы, змянілася некалькі палітычных пакаленняў.

Луіс Карвалан нарадзіўся 14 верасня 1916 у Пуэрта-Монтэ ў сям'і настаўніка і сялянкі. У 1931 паступіў у педагагічную вучэльню, а ўжо праз год уступіў у Камуністычную партыю. Сяброўства ў партыі адбілася на педагагічнай кар'еры. Па сканчэнні вучэльні настаўнічаў крыху больш за год і быў звольнены за палітыку.

Карвалан заняўся журналістыкай. Ад 1946 быў галоўным рэдактарам цэнтральнага друкаванага органа партыі — газеты «Сігла». У 1950 Карвалана арыштавалі, адправілі ў высылку, потым кінулі ў канцлагер. Тым часам партыйная кар'ера ішла ў рост. З 1958 Карвалан — ужо генеральны сакратар КПЧ.

Пасля перавароту генерала Пiначэта ў верасні 1973 ён быў арыштаваны разам з іншымі працаўнікамі рэжыму і кінуты ў канцлагер. Хунта пакарала смерцю 18 яго таварышаў.

Пасля забойства паэта Віктара Хары Карвалан стаў самым вядомым чылійскім палітвязнем. У 1976 на прапанову Андрэя Сахарава яго абмянялі на савецкага дысідэнта Уладзіміра Букоўскага. Перамовы вялі Кісінджэр і тагачасны шэф КДБ Андропаў.

Тады ж у савецкіх курылках нарадзіўся вершык:

Абмянялі хулігана
На Луіса Карвалана,
Дзе б узяць такую б…,
Каб на Брэжнева змяняць?

Смачны пацалунак падчас сустрэчы персанажаў гэтай прыпеўкі растыражавала савецкая кінахроніка.

Карвалан жыў у СССР да 1983, а пасля не пабаяўся вярнуцца ў Чылі. Нелегальна, змяніўшы з дапамогай пластычнай аперацыі твар. І наступныя шэсць гадоў знаходзіўся на падпольным становішчы. Гэта быў час «працы над памылкамі» для дэмакратычных сілаў Чылі. У пачатку 1970-х канфлікт між сацыялістамі, камуністамі і хрысціянскімі дэмакратамі, саветызм першых прывёў да ўлады Пiначэта. У канцы 1980-х паступовы пераход ад дыктатуры да дэмакратыі адбыўся менавіта дзякуючы саюзу камуністаў, сацыялістаў і хрысціянскіх дэмакратаў.

Пiначэт легалізаваў апазіцыю, пачаў з ёй дыялог пра будучыню краіны, з дапамогай эканамістаў-рыначнікаў (т.зв. «чыкагскія хлопчыкі») мадэрнізаваў эканоміку і, урэшце, у 1988, прайграўшы рэферэндум аб працягу паўнамоцтваў, аддаў уладу дэмакратам.

**Каб нелегальна вярнуцца ў Чылі, ён змяніў твар з дапамогай пластычнай аперацыі.**

Ад 1989 Карвалан жыў у Санцьяга ўжо афіцыйна.

Да канца жыцця ён заставаўся верным камуністычным, ці, хутчэй, левым поглядам. У 1995 Карвалан напісаў кнігу «Крушэнне савецкай сістэмы», у якой даказваў, што сталінізм ёсць найвялікшай трагедыяй для левага руху.

«Я перажыву Пiначэта хаця б з прынцыпу», — казаў ён у інтэрв'ю. І перажыў.

**Алег Гардзіенка**

# Самая вялікая беларуская амбасада — у Маскве, самая аддаленая — у Буэнас-Айрэсе

23 ліпеня міністр замежных справаў Беларусі Сяргей Мартынаў правёў нараду з кіраўнікамі замежных прадстаўніцтваў краіны.

«НН» вырашыла прыгадаць, дзе ж у свеце знаходзяцца беларускія дыпламатычныя пляцоўкі.

Сярод частак свету лідэрства па колькасці беларускіх амбасадаў належыць, безумоўна, Еўропе. З буйных і найважнейшых краін толькі ў Іспаніі, Нарвегіі, Фінляндыі ды Ірландыі няма беларускіх дыпламатычных прадстаўніцтваў. Да іх далучаюцца таксама невялікія краіны Балканскага паўвострава (акрамя Сербіі).

З еўрапейскіх дыппрадстаўніцтваў найбольш разгалінаваную структуру мае польскае — амбасада ў Варшаве, генконсульствы ў Беластоку і Гданьску, а таксама консульства ў Бялай Падляшскай.

Разгалінаваную структуру мае таксама амбасада ў Германіі — цэнтральная сядзіба ў Берліне і аддзел у Боне. Іншыя беларускія дыпламатычныя пляцоўкі ў Еўропе консульстваў і аддзелаў не маюць. Выключэннем тут ёсць суседка Латвія, дзе Беларусь мае генеральнае консульства ў Даўгаўпілсе (Дзвінску), побач з мяжой.

Большасць беларускіх пляцовак, якія размяшчаюцца ў Еўразіі, знаходзяцца ў рэспубліках былога СССР.

Найбуйнейшая з іх (і ўвогуле найбуйнейшае беларускае дыппрадстаўніцтва ў свеце) размяшчаецца ў Расіі. Акрамя непасрэдна амбасады ў Маскве, яшчэ дзесяць аддзелаў па ўсёй краіне — ад Калінінграда да Хабараўска.

Акрамя рэспублік былога Савецкага Саюза, у Еўразіі Беларусь прадстаўленая таксама ў Японіі, Паўднёвай Карэі, Кітаі, Індыі, В'етнаме, Сірыі, Турцыі, ААЭ і Ізраілі.

Апроч гэтага, дыпламатычныя пляцоўкі Беларусь мае яшчэ на трох кантынентах — Паўночнай і Паўднёвай Амерыках і ў Афрыцы. На ўсіх названых мацерыках ёсць па тры беларускія амбасады. У Афрыцы гэта прадстаўніцтвы ў Егіпце, Лівіі і ПАР, у Паўночнай Амерыцы — у ЗША, Канадзе і на Кубе, а ў Паўднёвай — у Венесуэле, Бразіліі і Аргенціне. Апошняя пляцоўка, дарэчы, з'яўляецца самай аддаленай ад Мінска.

Такім чынам, Беларусь мае свае афіцыйныя прадстаўніцтвы ў 45 дзяржавах са 192, якія на дадзены момант з'яўляюцца сябрамі ААН.

У рэшце краін свету, згодна з міждзяржаўным пагадненнем, інтарэсы нашай краіны прадстаўляе Расія.

**Алесь Пілецкі**

# Журналісцкая супольнасць бароніць «Салідарнасць» ад Ярашука

Група рэдактараў незалежных СМІ выступіла з заявай у падтрымку інтэрнэт-газеты «Салідарнасць». Нагодай для гэтага стаў ціск на інтэрнэт-рэсурс з боку прафсаюзных функцыянераў, а канкрэтна — старшыні Беларускага кангрэсу дэмакратычных прафсаюзаў Аляксандра Ярашука.

«Прынцыповая пазіцыя гэтага сайта ў дачыненні да некаторых негатыўных момантаў у беларускім прафсаюзным руху прывяла да таго, што супраць рэдакцыі былі высунутыя недарэчныя і беспадстаўныя абвінавачанні», — адзначаецца ў заяве. Таксама А. Ярашук забараніў журналістцы «Салідарнасці» Алене Якжык прысутнічаць на паседжаннні Рады БКДП.

Гэты крок, зазначаюць падпісанты, не стасуецца ні з дэмакратычнымі стандартамі, ні з ранейшымі заявамі самога Аляксандра Ярашука аб патрэбе ўсяляк падтрымліваць незалежную прэсу.

«Стаўленне да свабоды слова вызначае ўзровень дэмакратычнасці поглядаў саміх палітыкаў», — адзначана ў заяве.

З заклікам спыніць атакі на «Салідарнасць» выступілі рэдактар газеты «СНплюс. Свободные новости плюс» Васіль Зданюк, дырэктар інфармацыйнай кампаніі БелаПАН Алесь Ліпай, старшыня Беларускай асацыяцыі журналістаў» Жанна Літвіна, рэдактары: «Нашай Нівы» — Андрэй Скурко, «Народнай волі» — Іосіф Сярэдзіч, «Белорусов и рынка» — Вячаслаў Хадасоўскі, «Інтэкс-прэса» — Уладзімір Янукевіч ды іншыя.

**Сяргей Мікулевіч**



PHOTO.BYMEDIA.NET

Аляксандр Ярашук (справа) з Леанідам Сініцыным.

# У Мінску з кранаў цячэ вада з водарасцямі

«З крана чацвёрты дзень цячэ брудная карычневая вада. Звяртаемся ў ЖЭС — вынікаў няма, кормяць абяцаннямі. Я не хачу гэтага цярпець. Мы плацім за пітную ваду, а не за тэхнічную», — з такой праблемай звярнуўся ў рэдакцыю «НН» чытач Уладзімір Асавулаў, які жыве ў Маскоўскім раёне сталіцы. Падобныя званкі паступалі ад чытачоў з завулка Казлова, іншых раёнаў Мінска.

У ЖЭСе №99, куды звярнуўся карэспандэнт «НН», яго скіравалі ў «Мінскводаканал». Там удакладнілі, што колер вады ў Маскоўскім раёне насамрэч можа розніцца ад звычайнага. Патлумачылі гэта прычынамі біялагічнага характару і запэўнілі, што шкоды здароўю такая вада не робіць. Паабяцалі таксама, што ў найбліжэйшыя дні яна зноў стане празрыстай.

Але што ж за бруд цячэ з крана? Тлумачыць намеснік кіраўніка мінскай вадаправоднай сеткі Анатоль Чарнаморац: «Праз анамальную спёку ў вадзе, якую бярэ Мінск для сваіх патрэбаў, распладзіліся сіне-зялёныя водарасці. Пры кантакце з азонам, які выкарыстоўваецца для ачысткі вады, парэшткі тых водарасцяў надаюць вадзе карычневае адценне. Каб пазбегнуць гэтага, мы пачалі выкарыстоўваць актываваны вугаль замест азону». Аднак вада была і застаецца прыдатнай для піцця, кажа А.Чарнаморац і адзначае, што сам ён не ў лепшай сітуацыі: «Я ў Малінаўцы жыву. У нас некалькі дзён такое назіралася, аднак ужо сёння ўсё нармальна. У найбліжэйшыя дні сітуацыя нармалізуецца і ў іншых раёнах горада».

**Алесь Пілецкі**



**Цыянабактэрыі, або сіне-зялёныя водарасці**
(лац. Cyanobacteria, ад грэч. Κυανός — сіне–зялёны) — значная група буйных грамадмоўных бактэрый, здольных да фотасінтэзу, што суправаджаецца выпрацоўкай кіслароду. Сіне–зялёныя водарасці жывуць у любой сажалцы, і калі ўтвараецца крытычная маса, кажуць, што вада пачынае цвісці. Усё, што ім трэба, — гэта анамальная спякота і ежа — любыя арганічныя адкіды, якія злівае чалавек.

СКАНДАЛ



## Глыбоцкі ідэолаг спрабаваў сарваць канцэрт у памяць Ларысы Геніюш

Канцэрт мусіў прайсці 25 ліпеня ў межах парафіяльных урачыстасцяў каля касцёла **Святой Ганны (на фота)**. Бардаў запрасіла грамадская актывістка з Германавіч, лаўрэатка прэміі «За свабоду думкі» Ада Райчонак.

На правядзенне канцэрту была згода ксяндза Уладзіміра Шымуковіча. Аднак перад самай імпрэзай ксёндз выйшаў да арганізатараў і паведаміў, што «канцэрт не можа адбыцца». Відавочцы кажуць, што перад тым да яго падыходзілі ідэолаг Глыбоцкага райвыканкама Міхаіл Чарапкоўскі ды старшыня Удзельскага сельсавета.

Канцэрт усё ж адбыўся на беразе возера Царкавішча каля Мосара. Выступілі Зміцер Бартосік, Таццяна Беланогая. Свае песні праспявалі і маладыя жыхаркі мястэчка Германавічы Вольга Фёдарава і Валерыя Райчонак.

**Кастусь Шыталь, westki.info**

## Здарэнні сцісла

• **Рабочы сарваўся з 25-га паверха.** Гэта адбылося на збудаванні аднаго з аб'ектаў на вуліцы Багдановіча ў сталіцы. Падчас устаноўкі апалубкі ўпаў і разбіўся 41-гадовы рабочы.

• **Мінчук спрабаваў спаліць сябе.** 24 ліпеня каля 22-й гадзіны 60-гадовы мужчына ў скверы на вуліцы Вясёлкавай абліў сябе бензінам і падпаліў. З тэрмічнымі апёкамі 70% цела пенсіянер шпіталізаваны.

• **У надзіманым басейне патанула дзіця.** У Крычаве (Магілёўская вобласць) патанула дзяўчынка, якой быў год і дзесяць месяцаў. У двары дзіця засталося без нагляду ў надзіманым басейне і загінула.

• **У Ляхавіцкім раёне засіліўся 16-гадовы.** Трагедыя адбылася ў вёсцы Русінавічы. Цела сына раніцай у клуні знайшла яго маці. Жанчына шукала сына пасля таго, як ён не прыйшоў дамоў начаваць. Юнак павесіўся на дзязе. Прычынай суіцыду магла стаць сварка з дзяўчынай.

• **Спаліў свой дом** 53-гадовы жыхар вёскі Ясьманаўцы Вілейскага раёна. Папярэдне ён выгнаў з дома жонку, сам быў нецвярозы. Гэта была не першая спроба мужчыны падпаліць сваё жыллё. Першы раз ён спрабаваў спаліць дом пазалетась, а 12 ліпеня падпальваў хлеў.

• **Сходзіў ноччу ў сталоўку.** Са сталовай вёскі Брылькі, што ў Валожынскім раёне, невядомы злодзей вынес уначы касавы апарат, цыгарэты і спіртное. Сталоўка не ахоўвалася. Злачынца трапіў у памяшканне, высадзіўшы дзверы.

• **Памерла другая беларуска, якая пацярпела ў аўтааварыі ў Крыме.** Яшчэ адна беларуска загінула на месцы аварыі. У цяжкім стане застаецца кіроўца. ДТЗ адбылося 20 ліпеня. Кіроўца аўтамабіля «Пежо», жыхар Мінска, выехаў за межы праезнай часткі. Аўтамабіль занесла на паласу сустрэчнага руху, дзе ён сутыкнуўся «Таётай RAV-4», якая рухалася насустрач і ў якой ехала расійская сям'я.

• **Матацыкліст пратараніў тры аўтамабілі.** Кіроўца матацыкла «Судзукі» на МКАД, спрабуючы аб'ехаць аўтамабіль, які рухаўся наперадзе, сутыкнуўся з другім аўтамабілем. Пасля гэтага матацыкліст паспрабаваў перастроіцца і ўчыніў сутыкненне яшчэ з адным аўтамабілем, а затым, працягваючы рух, сутыкнуўся з машынай, якая стаяла на трэцяй паласе. З чэрапна-мазгавой траўмай лёгкай ступені і пераломам костак правага перадплечча ён шпіталізаваны. У выніку ДТЗ пашкоджаны матацыкл і тры аўтамабілі.

• **У Брэсце конь з карэтай пашкодзіў два аўто.** Конь бег па вуліцы без фурмана. Карэта належыць індывідуальнаму прадпрымальніку, які катаў людзей па набярэжнай. У адсутнасць фурмана конь нечакана паляцеў і зачапіў карэтай прыпаркаваныя «Шкода» і «Вольва». Ад удару карэта адчапілася, і конь пабег далей. Спыніць яго ўдалося недалёка ад ажыўленага пешаходнага перахода.

• **Мужчына патануў, абараняючы цяжарную жонку ад лебедзя.** 32-гадовы мужчына патануў, ратуючы жонку ад лебедзя. Гэта здарылася пад Рыгай у Латвіі. Яго цяжарная жонка, на дзевятым месяцы, падплыла заблізка да гнязда. Лебедзь атакаваў яе, баронячы сваё патомства. Муж падплыў на дапамогу. Але ў барацьбе з птушкай патануў.

**СМ; БелаПАН, «Рэгіянальная газета»**

## Самыя папулярныя спецыяльнасці абітурыентаў-2010: будаўнік, юрыст і фізрук

25 ліпеня скончыўся прыём дакументаў на дзённую бюджэтную форму навучання другога патоку ў ВНУ краіны. У лідэрах па колькасці абітурыентаў — БДУ і БНТУ. У кожны з універсітэтаў пададзена ўжо больш за паўтары тысячы заяваў.

Найбольшым попытам у БДУ пакуль карыстаюцца гістарычны факультэт (спецыяльнасць «Дакументазнаўства»), міжнародных адносін, прыкладной матэматыкі і інфарматыкі («Актуарная матэматыка, інфарматыка, камputарная бяспека»), юрыдычны («Правазнаўства», «Эканамічнае права»). У БНТУ гэта аўтатрактарны («Аўтасэрвіс») і будаўнічы факультэты («Прамысловае і грамадзянскае будаўніцтва»).

Значна адстаюць БДУІР і БДТУ. У БДУІРы найменшы конкурс на спецыяльнасці «Метралагічнае забяспечанне інфармацыйных сістэм і сетак» (ф-т тэлекамунікацый), «Квантавыя інфармацыйныя сістэмы» (ф-т радыётэхнікі і электронікі). Магчыма, абітурыенты з заявамі падцягнуцца ў апошнія дні.

З якімі прафесіямі звязваюць жыццё ў рэгіёнах? Тут перавага аддаецца спецыяльнасцям «правазнаўства», «фізічная культура».

У Баранавіцкім дзяржаўным універсітэце найбольшая колькасць абітурыентаў паступае на спецыяльнасці факультэта эканомікі і права. У Палескім дзяржаўным універсітэце (Пінск) — «Банкаўская справа, эканоміка, фінансы, бухулік, маркетынг». Гродзенскі універсітэт імя Янкі Купалы — «Тэхнічная эксплуатацыя аўтамабіляў», «Абсталяванне і тэхналогіі высокаэфектыўных працэсаў апрацоўкі матэрыялаў», «Прамысловае і грамадзянскае будаўніцтва». Віцебскі імя Машэрава — «Правазнаўства», «Фізічная культура». Гомельскі імя Скарыны — «Геалогія», «Правазнаўства», Магілёўскі імя Куляшова — «Фізічная культура», «Правазнаўства».

Прыём дакументаў на завочную бюджэтную форму працягнецца да 2 жніўня, а на дзённае і завочнае на платнай аснове — да 4 жніўня. Залічэнне адбудзецца ад 1 да 6 жніўня.

Залічэнне ў вышэйшыя навучальныя ўстановы першага патоку (сілавыя ВНУ, Акадэмія музыкі, Акадэмія мастацтваў, БДУ культуры і мастацтваў) праходзіць ад 24 да 28 ліпеня.

Сёлета 55 ВНУ Беларусі плануюць прыняць амаль 103 тысячы абітурыентаў на ўсе формы навучання.

І толькі кожнае трэцяе месца будзе бюджэтным.

**Кастусь Матушыч**

## «Советская Белоруссия» замовіла «Камунарцы» партыю «салодкай праўды»




Фабрыка вырабіла партыю фірмовых шакаладак. На вокладцы размешчаныя лагатып газеты і слоган «Пакаштуй праўду на смак!»

«З Паўлам Ізотавічам я даўно не сустракаўся. Але я не выключаю таго, што пад уплывам дзейнасці кампаніі не толькі «Советская Белоруссия», але і ўсе нашы дзяржаўныя СМІ рушаць у кірунку праўды. І, разам, узяўшыся за рукі, мы так і выйдзем да светлай будучыні. Чаму не?!» — пажартаваў наконт гэтага Уладзімір Някляеў у інтэрв'ю «Еўрарадыё».

«Советская Белоруссия» выдаецца за грошы падаткаплатнікаў. Пры гэтым яна адлюстроўвае пазіцыю Аляксандра Лукашэнкі і не дае слова ягоным апанентам.



# Скокі са смерцю

Парады кахання сталі сучаснай версіяй колішніх карнавалаў. Днём, калі дазволена ўсё. Піша **Віталь Тарас**.

20 загінула, каля 350 паранена — гэта няпоўныя вынікі суботняй трагедыі ў нямецкім Дуйсбургу. Падчас фестывалю музыкі Love Parade («Парад кахання») ад цісканіны ў шматтысячным натоўпе ўсчалася паніка... Міжволі ўспомнілася трагедыя на Нямізе ў Мінску. 30 траўня 1999 у штурханіне ў падземным пераходзе метро загінулі 53 чалавекі. З іх — 42 дзяўчыны.

У Дуйсбургу, як і ў Мінску, абсалютная большасць ахвяраў — моладзь ад 14 да 20 гадоў.

Адзінаццаць гадоў таму ў сталіцы Беларусі таксама праходзіла свята (якое супала з праваслаўнай Сёмухай) з удзелам музыкаў. Арганізатарамі выступілі бровар «Аліварыя» і гарадскія ўлады. Кароткая навальніца ў раёне Нямігі спыніла «свята піва». Апошнім перад трагедыяй паспеў выступіць расійскі рок-гурт «Манга-Манга». Спроба гледачоў схавацца ад залевы ў найбліжэйшай хованцы скончылася пачварнай цісканінай...

Ёсць відавочная розніца паміж той трагедыяй і трагедыяй у Дуйсбургу. Па-першае — маштаб.

У Мінску загінула нашмат больш людзей. Пры тым, што на фэсце ў Германіі сабралося каля 1,4 мільёна чалавек. (Нічога падобнага ў Беларусі нельга нават уявіць).

Гарадская плошча каля былога чыгуначнага вакзала ў Дуйсбургу, дзе праходзіў канцэрт, у нармальных умовах можа змясціць 250 тысяч чалавек. У рэальнасці людзей было нашмат больш. Калі паліцыя, ратавальнікі і хуткая дапамога пачалі вывозіць пацярпелых і трупы, пераважная большасць удзельнікаў фэсту нічога не заўважыла, і канцэрт працягваўся яшчэ шэсць гадзін. (Гэта нагадвае іншае надзвычайнае здарэнне ў Мінску, калі канцэрт з нагоды 3 ліпеня працягваўся пасля таго, як выбухам бомбы ў пакеце з-пад соку там былі параненыя некалькі дзясяткаў чалавек). У Германіі большасць загінула не ў тунэлі, які вёў на плошчу, але на подступах да яго. Некаторыя людзі ў паніцы скокалі праз парапет уніз, з вышыні ў некалькі метраў, і разбіваліся.

У абодвух выпадках загінулі юнакі і дзяўчаты.

У абодвух выпадках арганізатары не задумлялі нічога благога. Фэст музыкі тэхна шмат гадоў праходзіў пад назвай «Парад кахання». Першы прайшоў у Берліне ў 1989 пад дэвізам «Мір, радасць, бліны!» Заснавальнік Love Parade, вядомы як Доктар Мотэ, кажа, што канцэпцыя фэсту — супрацьпаставіць музыку і скокі «звадам і нянавісці ў нашым грамадстве».

І што ж... Такія выпадкі неаднойчы здараліся, і, як гэта ні жахліва, будуць здарацца ў месцах масавага збору людзей. Гэта сведчыць пра тое, што людзі ў экстрэмальных сітуацыях часцяком пачынаюць кіравацца інстынктам. А ён можа быць і згубным. Зрэшты, вядома, што ў натоўпе цяжка заставацца чалавекам. У натоўпу свае законы.

Зразумела, заўжды хочацца знайсці вінаватых у трагедыі. Але каго тут вінаваціць? Арганізатараў, паліцыю, улады? А можа, усю нашу цывілізацыю ды страту веры ў Бога? Прынамсі, заўжды варта памятаць найперш пра цану жыцця і смерці.

А яшчэ размова пра нашу маральную адказнасць і пра тое, якія ўрокі мы выносім пасля кожнай такой трагедыі. Арганізатары Love Parade адразу заявілі, што гэта быў апошні фэст. Праводзіць падобныя святы ў будучыні было б здзекам з памяці загінулых.

У Беларусі трагедыю Нямігі-99, канечне, памятаюць. Але піўныя ды рознага кшталту іншыя масавыя святы праходзяць рэгулярна па ўсёй краіне, часам без дай прычыны.

Як было напісана на эмблемах фэсту ў Дуйсбургу — «Dance or Die!» («Танчы або памры!») Скокі са смерцю працягваюцца.

# Сіла беларускай нацыі, вымераная Вікіпедыяй

Інтэрнэт–энцыклапедыя «Вікіпедыя» сёння налічвае звыш 25 тысяч беларускамоўных артыкулаў. Для параўнання: украінцы маюць 217 тысяч, літоўцы — 111.

Вікіпедыя — знак часу. Гэта раней энцыклапедыі ствараліся з найвышэйшага дазволу манархаў і ЦК. Інтэрнэт-энцыклапедыю пішуць усе ахвотныя. Хто хоча — той і дадае артыкул. Хто хоча — той і правіць. Мадэратары проста адсейваюць памылкі і нецэнзуршчыну.

Вікіпедыя — надзвычай папулярны інтэрнэт-рэсурс. У ёй шукаюць інфармацыю, тлумачэнні невядомых словаў. Асабліва ўпадабалі такую энцыклапедыю школьнікі ды студэнты. Яе выкарыстоўваюць у навучанні і для збору звестак. За ёй будучыня.

Найбольшая вікіпедыя — па-ангельску. Яе складаюць больш за 3 300 000 артыкулаў.

Моцныя сярэднееўрапейскія нацыі — сербы, славакі, чэхі, венгры, румыны — маюць у Вікіпедыі ад 100 да 160 тысяч артыкулаў.

Беларуская мова ў Вікіпедыі прадстаўленая таксама даволі шырока. Асабліва калі параўноўваць з бездзяржаўнымі ці азіяцкімі народамі. Моцна даецца ў знакі стары правапісны раскол.

На сёння колькасць беларускіх артыкулаў на wikipedia.org складае 46 тысяч — 21 тысяча афіцыйным правапісам і 25 тысяч тарашкевіцаю. Але тэксты збольшага дублююцца.

У аналагічнай сітуацыі знаходзяцца толькі нарвежцы, у якіх ёсць аналаг нашага класічнага правапісу: далейшая ад дацкай нованарвежская і бліжэйшы да дацкай букмол.

Колькі ж беларусаў твораць электронны кампендыум ведаў сваёй нацыі? 25 тысяч добраахвотнікаў агулам узялі ўдзел у складанні абедзвюх версій электроннай энцыклапедыі.

Цікава паназіраць за вікіпедычнымі справамі ў суседзяў. Польскі раздзел Вікіпедыі (706 тысяч артыкулаў) займае 4-е месца ў свеце і перасягае расійскі (547 тысяч). На ўзроўні Беларусі размяшчаецца суседка-Латвія (28 тысяч). Трохмільённыя літоўцы маюць 111 тысяч артыкулаў. Украінцы — 217 тысяч, і збіраюцца нарошчваць працу. Папярэдні ўкраінскі міністр адукацыі Іван Вакарчук заахвочваў кожнага навуковага супрацоўніка напісаць 2—3 артыкулы для Вікіпедыі і прыцягваць да працы студэнтаў.

На фоне іншых постсавецкіх краін сіратліва глядзіцца армянская вікіпедыя колькасцю 9,5 тысяч тэкстаў. Сярод народаў, каланізаваных Расіяй, бадзёра трымаюцца сваёй культуры чувашы. На гэтай мове налічваецца 11 тысяч артыкулаў. А пра ўзровень пагрому чачэнцаў сведчыць мізэрнасць чачэнскай мовы ў Вікіпедыі: толькі 651 артыкул.

Увогуле, сярод бездзяржаўных нацый упэўнена наперадзе ідуць каталонцы, што жывуць у Іспаніі, краіне Еўрасаюза, з 252 тыс. артыкулаў.

«Трэба браць да ўвагі не толькі колькасць, але і якасць, змястоўнасць артыкулаў», — лічыць паэт і дыпламат Генадзь Бураўкін. На думку паэта, свядомыя беларусы, на жаль, шмат часу адводзяць правапісу, хоць праблема цяпер — у самім існаванні мовы.

Намеснік дырэктара Гродзенскага шклозавода Даніла Жукоўскі лічыць, што ў інтэрнэце часам бываюць матэрыялы, не горшыя за аналагічныя ў папяровых энцыклапедыях, нават лепшыя. «Калі б у нас гэтая справа прапагандавалася, хаця б вашымі сродкамі, — звяртаецца Даніла Жукоўскі да чытачоў «Нашай Нівы», — была б карысць аўтарам і наведвальнікам Вікіпедыі».

Праект «Вікіпедыя па-беларуску» існуе з канца жніўня 2006.

Этымалогія назвы электроннай энцыклапедыі паходзіць ад гавайскага wikiwiki — вельмі хутка, што падкрэслівае хуткасць і лёгкасць рэдагавання праекту.

**Юльян Місюкевіч**

Звесткі пра колькасць артыкулаў і насельніцтва ўзятыя з Вікіпедыі. Пазначаныя ўсе вікіпедыі, большыя за 100 тыс. З меншых за 100 тыс. — толькі частка.

Усяго вікіпедыі існуюць на 272 мовах. Па колькасці артыкулаў беларуская вікіпедыя класічным правапісам займае 67–е месца сярод іх, акадэмічным — 73–е. Калі іх механічна злучыць, беларуская мова апынецца на 49–м месцы, абганяючы грузінскую.

Як бачым, у некаторых нацыях меншая колькасць інтэрнаўтаў стварыла большую колькасць артыкулаў. У іншых — большая колькасць менш пладавітых аўтараў. Як правіла, носьбіты еўрапейскіх моваў апярэджваюць азіяцкіх і афрыканскіх па пранікненні ў інтэрнэт. Таксама многія нацыі Трэцяга свету, як індыйцы, у інтэрнэце працягваюць карыстацца пераважна мовай каланізатараў. У той жа час у Еўропе нацыі дасягнулі найвышэйшага развіцця сваіх культур, што адбіваецца на памеры вікіпедый.

| Мова | Колькасць артыкулаў, тыс. | Колькасць аўтараў, тыс. | Колькасць носьбітаў мовы ў краінах з мовай тытульнага насельніцтва, млн |
|---|---|---|---|
| Ангельская | 3345 | 12 676 | ... |
| Нямецкая | 1091 | 1 030 | 96 |
| Французская | 968 | 865 | 71 |
| Польская | 713 | 375 | 38 |
| Італьянская | 705 | 531 | 60 |
| Японская | 689 | 435 | 127 |
| Іспанская | 619 | 1 535 | ... |
| Нідэрландская | 610 | 326 | 22 |
| Партугальская | 591 | 753 | 200 |
| Расійская | 563 | 514 | 142 |
| Шведская | 362 | 182 | 9,3 |
| Кітайская | 315 | 858 | 1380 |
| Нарвежская (букмоль) | 266 | 166 | 4,9 |
| Каталанская | 252 | 64 | 7,5 |
| Фінская | 243 | 153 | 5,4 |
| Украінская | 217 | 74 | 46 |
| Чэшская | 168 | 118 | 10,5 |
| Венгерская | 166 | 143 | 10 |
| Румынская | 147 | 150 | 25 |
| Турэцкая | 147 | 294 | 73 |
| Карэйская | 141 | 120 | 73 |
| Дацкая | 132 | 108 | 5,5 |
| Эсперанта | 132 | 38 | ... |
| Арабская | 129 | 295 | ... |
| Інданезійская | 128 | 189 | 232 |
| Вьетнамская | 125 | 184 | 87 |
| Сербская | 117 | 66 | 7,3 |
| Славацкая | 116 | 48 | 5,5 |
| Літоўская | 111 | 38 | 3,3 |
| Іўрыт | 106 | 117 | ... |
| Балгарская | 103 | 72 | 7,6 |
| Персідская | 96 | 177 | 75 |
| Славенская | 88 | 66 | 2,1 |
| Харвацкая | 83 | 57 | 4,5 |
| Эстонская | 76 | 29 | 1,3 |
| Нованарвежская (нюнорск) | 58 | 23 | 0,5 |
| Хіндзі | 55 | 31 | 1180 |
| Грэчаская | 54 | 66 | 11,3 |
| Грузінская | 42 | 25 | 4,6 |
| Азербайджанская | 36 | 20 | ... |
| Латышская | 28 | 19 | 2,4 |
| Албанская | 27 | 21 | 5,7 |
| Беларуская (класічным правапісам) | 25 | 12 | ... |
| Беларуская (школьным правапісам) | 21 | 12 | 9,6 |
| Афрыкаанс | 16 | 23 | ... |
| Чувашская | 11 | 5,6 | 1,3 |
| Ірландская | 11 | 8 | ... |
| Армянская | 10 | 7 | ... |
| Чачэнская | 0,7 | 2,5 | 1,1 |

# «Геніюш — за Беларусь! Як мы можам быць супраць?»

**У Ваўкавыску міліцыя сканфіскавала шыльду ў гонар Ларысы Геніюш, вырабленую з дапамогай кампаніі «Гавары праўду». Райвыканкам сцвярджае, што ініцыятары не выканалі фармальнасцяў.**

Мемарыяльную шыльду меркавалі змясціць на хаце, у якой нарадзілася Ларыса Геніюш, 27 ліпеня. Геніюш (у дзявоцтве Міклашэвіч) нарадзілася ў фальварку Жлобаўцы, але пазней сваякі перавезлі гэты дом у Ваўкавыск, ён цяпер стаіць на вуліцы Перамогі, 40. Гэта прыватны будынак, у ім дагэтуль жывуць людзі.

Памятную шыльду вырабіў мясцовы прадпрымальнік і краязнавец Мікалай Кавальчук. Фінансавала выраб кампанія «Гавары праўду». На ўрачыстае адкрыццё ў Ваўкавыск прыехалі паэты Уладзімір Някляеў і Міхась Скобла, сабралася грамада. За некалькі хвілін да пачатку цырымоніі Мікалая Кавальчука затрымала міліцыя і адвезла ў пастарунак. Шыльду садралі з будынка і сканфіскавалі.

Міліцыя патлумачыла канфіскацыю тым, што Кавальчук незаконна ўсталяваў шыльду. А потым вуліца ўвогуле была перакрытая супрацоўнікамі газавай службы, якія казалі, што «ёсць праблемы».

Лідэр кампаніі «Гавары праўду» Уладзімір Някляеў пайшоў у пастарунак і дабіўся, каб Кавальчука выпусцілі. Кавальчук напісаў заяву ў міліцыю з нагоды канфіскацыі. Бо, паводле яго словаў, будынак прыватны, і з гаспадарамі была дасягнутая дамоўленасць, дазволу ўладаў на ўсталяванне шыльды ў гэтым выпадку не патрабуецца.

Намеснік старшыні Ваўкавыскага райвыканкама па ідэалогіі Ігар Кашкевіч кажа адваротнае. Паводле яго словаў, у райвыканкаме ёсць пісьмовая заява ад уласніка дома, сп.Трацяка, у якой ён выказваецца супраць усталявання шыльды. «Але і гэта не галоўнае. Перш чым ставіць памятную дошку, неабходна выканаць некалькі пунктаў, каб усё было па законе, — адзначае ідэолаг. — Найперш — правесці праект шыльды праз экспертна-мастацкую раду ў Гродне. Як мы нядаўна праводзілі памятны знак да юбілею Грунвальда. А ад ініцыятараў шыльды па Геніюш — анічагуткі, ніякіх дакументаў. Адзін раз прыйшоў Кавальчук, яму адказалі — і ўсё».

Супраць асобы Ларысы Геніюш, па словах спадара Кашкевіча, у райвыканкаме нічога не маюць супраць: «Яна — наша зямлячка, выдатная паэтка, і яна — за Беларусь. Як мы можам быць супраць?»

Міліцыя заявіла, што шыльда будзе затрыманая да суда, які высветліць, хто і з якой мэтай усталёўваў мемарыяльную дошку.

Варта адзначыць, што ў аддзеле архітэктуры і будаўніцтва Мінгарвыканкама нам адказалі, што няма такога нарматыўнага акту, паводле якога ўласнік прыватнага дома мае пытацца дазволу на ўстаноўку шыльды ў сябе на хаце. На практыцы гэта пацвярджае прыклад прыватнага музея Анатоля Белага ў Старых Дарогах: «У мяне вакол хаты 80 помнікаў, і ад мяне ніхто ніколі не патрабаваў дазволу», — кажа энтузіяст.

**Алесь Пілецкі, Ваўкавыск;**
**Сяргей Мікулевіч**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Міліцыянт усё разумее, але...**

# Байкова ў цяжкім стане

Стан Святланы Байковай, якая ўжо пяць месяцаў знаходзіцца ў СІЗА КДБ, цяжкі. Гэта тычыцца як фізічнага, так і маральнага аспекту, паведаміў адвакат Міхаіл Воўчак.

Якія дзеянні ў дачыненні да Байковай робяцца следствам, адвакат не сказаў. Адзначыў толькі, што новых абвінавачанняў падабароннай не выстаўлялася.

24 чэрвеня генеральны пракурор Рыгор Васілевіч падоўжыў тэрмін утрымання пад вартай Святланы Байковай яшчэ на два месяцы — да 24 жніўня. Пры гэтым раней Васілевіч заступаўся за Байкову.

Ці то ў следства з'явіліся жалезныя доказы віны Байковай, ці то КДБ даціснула генпракурора, але ўжо ў чэрвені Васілевіч сказаў: «Былі і перагібы. Не заўсёды арышты былі абгрунтаванымі і законнымі. Давайце не будзем ідэалізаваць следчага».

Святлана Байкова была затрыманая супрацоўнікамі КДБ 25 лютага. Крымінальныя справы ў дачыненні да яе старшыня Камітэта дзяржбяспекі Вадзім Зайцаў распачаў па артыкулах 399 (незаконнае вызваленне ад крымінальнай адказнасці) і 426 (перавышэнне ўлады або службовых паўнамоцтваў) Крымінальнага кодэкса.

У свой час Байкова займалася расследаваннем справаў брэсцкіх мытнікаў, па якой праходзілі дзясяткі людзей. У злачынную групоўку былі ўцягнутыя не толькі мытнікі, але і высокія чыны КДБ. Быў арыштаваны былы дырэктар дэпартамента фінансавых расследаванняў КДК Анатоль Грамовіч.

Паводле некаторых меркаванняў, настолькі маштабную аперацыю Байкова пачынала разам з былым міністрам унутраных справаў Уладзімірам Навумавым, але той падаў у адстаўку і з'ехаў у Расію.

Справу Грамовіча, нягледзячы на супраціў КДБ, усё ж не закрылі. Цяпер яна слухаецца за зачыненымі дзвярыма ў Вярхоўным судзе.

Дарэчы, па звестках «Ежедневника», Радай бяспекі былі выяўленыя пэўныя парушэнні ў дзеяннях супрацоўнікаў дэпартамента фінансавых расследаванняў КДК. Ёсць падазрэнне, што некаторыя следчыя «крышавалі» знаёмых прадпрымальнікаў. Але новых арыштаў перад прэзідэнцкімі выбарамі чакаць не даводзіцца. Хутчэй за ўсё, гэта скончыцца звычайнымі звальненнямі.

У турме Байкова правяла двухтыднёвую галадоўку пратэсту. Пры гэтым жанчына ўсё яшчэ працягвае звяртацца да Аляксандра Лукашэнкі з просьбай аб вызваленні, каб працягнуць «барацьбу супраць трутняў».

**ЗП**

# Беларускамоўны ідэолаг Брэстчыны пайшоў на павышэнне

**Аляксандр Рагачук стаў кіраўніком адміністрацыі Маскоўскага раёна Брэста.**

Чыноўнік Аляксандр Рагачук праславіўся тым, што па ягоным загадзе супрацоўнікі аддзела ідэалогіі Брэсцкага аблвыканкама адзін дзень на тыдзень, у серады, размаўлялі на працы выключна па-беларуску.

Пра ініцыятыву прыхільна напісалі ўсе рэспубліканскія СМІ, але ці змянілася нешта з таго часу? Аказваецца, Рагачук пайшоў на павышэнне. Цяпер ён кіраўнік аднаго з раёнаў Брэста — Маскоўскага. І гатовы працягваць беларусізацыю.



«Мы ў сваёй дзейнасці будзем працягваць карыстацца беларускай мовай. У нас чыноўнікі добра ведаюць родную мову, — паабяцаў ён у размове з карэспандэнтам «Еўрарадыё». — На паседжаннях выканкама будзем яе выкарыстоўваць». Спадар Рагачук дае ўпэўнены прагноз: «Мы з часам усё роўна пяройдзем на беларускую мову».

**Яўген Васількоў**

# З новым лордам!

**Працяг са старонкі 1.**

Лорду Чадлінгтану 68 гадоў. Ён з вядомага брытанскага роду. Ягоны бацька быў англіканскім святаром, а брат пэўны час працаваў ва ўрадзе кансерватараў.

Як і сённяшні кліент, за сваё жыццё лорд змяніў шмат прафесій. Вучыўся ў Кембрыджы і рыхтаваўся стаць, як бацька, святаром, але змяніў рашэнне і заняўся журналістыкай. Пісаў у асноўным пра бізнэс і сферу гандлю. У гэты час і зразумеў, што ўласна бізнэс яму цікавейшы за журналістыку.

У 1974 ён засноўвае кампанію па сувязях з грамадскасцю Shandwick. Ад 2005 Чадлінгтан узначальвае піяр-холдынг «Хантсуорт».

Цікавы факт біяграфіі: у 1997 лорда Чадлінгтана, які тады быў дырэктарам Брытанскага каралеўскага опернага тэатра, звольнілі з пасады. Адбылося гэта пасля дакладу ў палаце грамад — за «жахлівую некампетэнтнасць, катастрафічнае фінансавае планаванне і пралік»: за два гады ён давёў оперу ледзь не да банкруцтва.

Цікава, як пойдуць справы ў Чадлінгтана з фінансавым планаваннем у Беларусі?



Галоўнай задачай яму ставяць прыцягненне замежных інвестыцый у беларускую эканоміку.

**Зміцер Панкавец**

## З'едлівы сцёб ад «Ляпісаў»

**Гурт «Ляпіс Трубяцкой» запісаў беларускамоўную песню «Купляй беларускае!»**

Але новая кампазіцыя не штурхае да падтрымкі айчынных вытворцаў. Музыкі высмейваюць патугі прымусіць набываць тавары «Made in Белараша».

«Галавой разбіў кірпіч.
Абас…аў у пад'ездзе кафлю.
Хай гарыць мой дзікі зніч,
Калі я ў Еўропу траплю».

Як адзначыў прадусар гурта Яўген Калмыкоў, гэтую песню музыкі не ўспрымаюць сур'ёзна. «Мы не планавалі ўключаць яе ў які-кольвек альбом, бо гумар тэксту могуць зразумець толькі ў Беларусі». Ён таксама раіць не разглядаць кампазіцыю ў кантэксце агульнай творчасці. Маўляў, такая забаўка «Ляпісаў».

Запіс быў прымеркаваны да заканчэння першага фестывалю беларускамоўнай рэкламы «Adnak!»

**Кастусь Матушыч**

# «Гістарычна мы зрабілі абсалютна слушна»

**27 ліпеня споўнілася 20 гадоў з дня, калі Вярхоўны Савет прыняў Дэкларацыю аб дзяржаўным суверэнітэце Беларускай ССР.**

Памятаю, у той дзень мы з татам і цёткаю ездзілі ў госці да сваякоў у Іванаўскі раён. У дарозе слухалі трансляцыю з Авальнай залы. Там адбывалася неймавернае: вялася гаворка пра суверэнітэт Беларусі. Яшчэ некалькі месяцаў таму гэта было табу.

Дыскусія была напружаная, змагаліся дзве канцэпцыі. Адна, умоўна кажучы, «дазволеная Масквой», тыпу той, якую за пару дзён да таго прыняла Украіна. Другая — умоўна кажучы, «прыбалтыйская».

Паводле першай, суверэнітэт абвяшчаўся, але легітымнасць СССР не ставілася пад сумнеў. Паводле другой, незалежнасць не абвяшчалася, а пацвярджалася, аднаўлялася. Пры такой пастаноўцы пытання ўваходжанне ў СССР аўтаматычна разглядалася як нелегітымнае, а знаходжанне земляў Беларускай Народнай Рэспублікі ў СССР — як акупацыя.

Першы варыянт суверэнітэту даваў шанец Саветам захаваць кантроль. Так пасля будзе з суверэнітэтамі аўтаномій у Расіі, якія рэальна акажуцца незрэалізаванымі. Паказальна, у самой дэкларацыі ўжывалі слова «суверэнітэт», а не «незалежнасць».

Другі варыянт ствараў пераемнасць з БНР і адмаўляў пераемнасць з СССР.

Народы Балтыі выбралі другі варыянт, што выклікала шал Масквы. Такім чынам яны засцерагаліся ад любых юрыдычных падставаў для ўдзелу СССР у вырашэнні свайго лёсу.

Прыняць такі варыянт у Беларусі было нерэальна. Аднак сама пастаноўка пытання моцна ўплывала на мазгі. Я, 16-гадовы юнак, адразу засімпатызаваў варыянту БНФ, варыянту аднаўлення БНР — без аніякай сувязі з праклятым СССРам.

Варыянт Дэкларацыі, прапанаваны Народным Фронтам, наколькі я памятаю, набраў 47 галасоў. Тактычны крок — такі самы варыянт у мякчэйшай форме, прапанаваны дэпутатам ад Оршы Яўгенам Глушкевічам і падтрыманы дэпутатам ад Мінска Віктарам Ганчаром, сабраў 57 галасоў. Гэтыя лічбы, як і дэталі той трансляцыі, дагэтуль трымаюцца ў галаве. Так суперажываў я, юнак, таму, што адбывалася ў далёкім Мінску, у ягоным цэнтры, пад камуністычнымі барэльефамі Авальнай залы. Аднак і прынятая ў выніку трыма сотнямі галасоў Дэкларацыя ў «дазволенай» форме была рэвалюцыйнай па змесце, бо легалізавала ідэю незалежнасці і дэзарыентавала савецкую ідэалагічную машыну.

Удзельнік тых падзей, дэпутат парламента ад Наваполацка Лявон Баршчэўскі, расказвае пра некаторыя моманты прыняцця дакумента, які зрабіў Беларусь дзяржавай.

**Андрэй Дынько**



**«НН»: Чаму не ўдалося захаваць пераемнасць паміж незалежнасцю 1918 і 1990? Чаму ў Дэкларацыі няма згадак пра БНР?**

**Лявон Баршчэўскі:** У першым праекце Дэкларацыі, які Апазіцыя БНФ прадставіла ў першы ж дзень сесіі Вярхоўнага Савета, была згадка пра Вялікае Княства Літоўскае і Беларускую Народную Рэспубліку як папярэднікаў нашай дзяржаўнасці. Аднак той праект быў адразу ж адхілены. Камуністычная большасць і слухаць нічога не хацела, яна ведала пра БНР хіба са сваіх партшколаўскіх лекцый. Шанцаў захаваць пераемнасць не было. Нават калі прымалася Канстытуцыя 1994, дзе ў праекце таксама былі адсылкі да БНР, там выкарысталі іншую фармулёўку — «абапіраючыся на шматвяковую традыцыю беларускай дзяржаўнасці». Гэта задаволіла ўсіх.

Адсутнасць гістарычнай адукацыі перашкаджала ў першую чаргу. Страх перад Масквой таксама браў сваё. Усе былі ў рабалепным становішчы перад Крамлём. Калі б там сказалі, што трэба галасаваць за БНР, то і прагаласавалі б.

**«НН»: Якія пазіцыі Дэкларацыі было найцяжэй «прабіць»?**

**ЛБ:** Грамадзянства, свая валюта і свае Узброеныя сілы. На гэта камуністычная аснова Вярхоўнага Савета не хацела згаджацца. Урэшце ўдалося дамагчыся кампрамісу. Прынялі хітрую фармулёўку — «мае права на валюту, грамадзянства і Узброеныя сілы». Гэта была наша вялікая перамога.

**«НН»: Здавалася б, гэтыя пункты базавыя для незалежнай дзяржавы.**

**ЛБ:** Абсалютная большасць дэпутатаў не была гатовая да суверэнітэту. Для іх гэта была нейкая гульня ў незалежную краіну. Першы раз за пастаноўку пытання ў парадак дня прагаласавала толькі 65 чалавек. Потым Мікалай Дземянцей пабываў у Маскве і рэзка змяніў сваё стаўленне. Відаць, пасля таго як Расія 12 чэрвеня прыняла сваю Дэкларацыю аб суверэнітэце. Дземянцей вярнуўся з процілеглымі пазіцыямі.

**«НН»: Як успрымалі жыхары Беларусі прыняцце Дэкларацыі?**

**ЛБ:** Мы шмат тады ездзілі па краіне, сустракаліся з людзьмі ў сталіцы і па рэгіёнах. Тлумачылі ўсё па пунктах. Тая актыўная частка, якая прыходзіла на сустрэчы, на мітынгі, — яна ўспрымала пазітыўна. Мы тлумачылі, чаму неабходная незалежнасць. А сярод людзей хадзіла легенда пра Машэрава, які не хацеў Маскве аддаваць харчаванне, якога і так бракавала. Людзі думалі, што менавіта таму Машэрава і забілі, што не апошнюю ролю ў гэтым адыграла адсутнасць суверэнітэту і незалежнасці ад Масквы. Людзі лёгка ўспрымалі тыя ідэі. Дыктат Масквы тады быў відавочны.

**«НН»: А праціўнікі Дэкларацыі былі?**

**ЛБ:** Калі падпісалі Віскулёўскія пагадненні, сацыялагічныя службы падавалі да 69% прыхільнікаў такога рашэння сярод насельніцтва. Народ ужо саспеў на той час. У ліпені 1990 працэнт быў меншы. Але менавіта актыўная частка, нават і сябры КПСС, прыхільна ставілася да суверэнітэту. Яны лічылі, калі прыняць такую дэкларацыю, потым можна будзе пагандлявацца з Масквой.

**«НН»: 27 ліпеня 1990 у вас не было адчування, што незалежная Беларусь — гэта фантастыка?**

**ЛБ:** У мяне такое адчуванне было ў пачатку 1990. Тады думалася што прыхільнікаў незалежнасці ў нас можна на адной канапе пасадзіць. Але падзеі развіваліся хутка. На выбарах кандыдаты ад БНФ раптам былі выбраныя. А хто не быў, то набраў 48—49% галасоў. З усімі падтасоўкамі.

Тады з'явілася адчуванне, што нас шмат хто падтрымлівае і што ідэя правільная. Потым быў Сойм БНФ, які канчаткова паставіў мэту дасягнення незалежнасці. Паступова мы ў гэта паверылі. У тым ліку дзякуючы напорыстасці Зянона Пазняка, які пастаянна паўтараў, што нам без незалежнасці нікуды.

Думаю, што гістарычна мы зрабілі абсалютна слушна. Учора я ехаў у таксі і таксіст увесь час хваліў Лукашэнку за тое, што ён трымаецца незалежнасці.

**«НН»: Варта лічыць 27 ліпеня Днём незалежнасці? Альбо выбраць іншую дату?**

**ЛБ:** Калі Анатоль Вярцінскі, дэпутат, прапанаваў абвясціць 27 ліпеня святам, Сяргей Навумчык сказаў, што гэта пакуль не такі і важны дзень у параўнанні з 25 сакавіка. На што Вярцінскі адказаў мудрай фразай: «Беларусам трэба прывыкаць да незалежнасці. Калі яна будзе святкавацца 3—4 разы на год, то не зашкодзіць».

Канчатковую ж незалежнасць, я лічу, мы здабылі нават не 25 жніўня 1991, калі Дэкларацыя набыла моц закона, а 10 снежня, калі была дэнансаваная саюзная дамова. Вось гэта быў найважнейшы акт. Тады была пастаўленая кропка.

Я лічу, што дата 10 снежня таксама прэтэндуе на тое, каб быць днём беларускай незалежнасці. 25 сакавіка, 27 ліпеня, 25 жніўня і 10 снежня — вось чатыры даты, якія мы маем права святкаваць.



**Лявон Баршчэўскі**

Нарадзіўся 4 сакавіка 1958, лінгвіст, перакладчык, грамадскі дзеяч і палітык, былы старшыня Партыі БНФ. У перыяд 1990 — 1995 быў дэпутатам Вярхоўнага Савета XII склікання, уваходзіў у склад парламенцкай апазіцыі БНФ. Быў сябрам Камісіі па пытаннях адукацыі, культуры і захавання гістарычнай спадчыны, а таксама сябрам Камісіі па міжнародных справах і замежнаэканамічнай дзейнасці.

# Каб правесці Дэкларацыю, БНФ пайшоў на хітрасць

Урыўкі з кнігі **Сяргея Навумчыка** «Сем гадоў Адраджэння» пра падзеі 26—27 ліпеня 1990.

Ёсць выпадкі — і ў гісторыі іх багата, — калі нацыя здабывае незалежнасць вайной, баявымі дзеяннямі. У такім разе цэнтрам робіцца ваенны ці партызанскі штаб, аргументам выступае зброя. Там, дзе суверэнітэт дасягнуты мірным шляхам, дзе выкарыстоўваюцца палітычныя механізмы, цэнтрам змагання робіцца парламент.

[У часе абмеркавання] ішло да таго, што Дэкларацыя ўвогуле магла быць не прынятая. Так, дэпутат Леанід Козік (сябар Прэзідыума ВС, пры Лукашэнку — лідэр праўладных прафсаюзаў) падчас абмеркавання заявіў, што «калі мы прымем тую Дэкларацыю, дык яна накіраваная на 100 працэнтаў на наўпросты выхад з Саюза».

У гэтых умовах Пазняк прапанаваў дэпутатам БНФ, калі большасць будзе настойваць на «саюзнай дамове» і адмовіцца ад канстытуцыйнасці Дэкларацыі, выйсці з Авальнай залы. Гэта мела б псіхалагічны эфект, заблытала б дэпутатаў, яны б дзейнічалі ад «супрацьлеглага», «насуперак» БНФ. Прапанова была рызыкоўная, але Пазняку ўдалося пераканаць у яе слушнасці.

У той момант Пазняк паставіў на карту свой аўтарытэт сярод калегаў; калі б тактыка не спрацавала і Дэкларацыя была не прынятая ці адбылася б рэвізія ўжо прынятых артыкулаў, ён успрымаўся б сваімі ж паплечнікамі як авантурыст. Аднак ён пайшоў на такую рызыку.

Я бачыў, які эфект зрабіў выхад з залы двух дзясяткаў дэпутатаў на чале з Пазняком на дэпутатаў-камуністаў: «Яны не хочуць галасаваць! Ну дык мы прагаласуем».

У выніку Дэкларацыя аб дзяржаўным суверэнітэце БССР была прынятая. Нават ва «ўсечаным» варыянце Дэкларацыя была значным крокам наперад — да таго ж, на працягу двухдзённых дэбатаў нам удалося адстаяць некаторыя істотныя палажэнні, напрыклад, бяз'ядзернасць Беларусі.

**Паводле Дэкларацыі аб суверэнітэце**

Беларусь абвяшчалася суверэннай дзяржавай, «на аснове ажыццяўлення беларускай нацыяй яе неад'емнага права на самавызначэнне, дзяржаўнасці беларускай мовы, вяршэнства народа ў вызначэнні свайго лёсу». Найвышэйшай мэтай суверэнітэту прызнавалася забяспечанне свабоднага развіцця і дабрабыту грамадзянаў. Носьбітам суверэнітэту краіны і адзінай крыніцай дзяржаўнай улады абвяшчаўся беларускі народ.

# Рэпартаж з неаліту

Археалагічная экспедыцыя Міхася і Максіма Чарняўскіх адшукала на Крывінскім тарфяніку самы старажытны беларускі музычны інструмент. Ён зроблены з косткі бусла.

Археолагі — яны як дэтэктывы. З тым адрозненнем, што з'яўляюцца на месца падзей не праз 3—4 гадзіны пасля здарэння, а праз 4—5 тысячагоддзяў... І таксама вымушаныя шукаць сведчанні і прыглядацца да драбязы.

На захад ад Віцебска на Дзвіне стаяць Бешанковічы. На поўдзень ад Бешанковічаў ёсць старая вёска Асавец. А за ёй, яшчэ на поўдзень, раскінуліся асушаныя тарфянікі з чэзлым бярэзнічкам. Рэчка Крывінка сканалізаваная меліяратарамі, раней яна пятляла па торфе. На гэтым месцы 5 тысяч гадоў таму была, як мяркуюць археолагі, сістэма азёраў, злучаных пратокамі. Паселішча Асавец-2, якое даследуюць Міхась і Максім Чарняўскія з групай студэнтаў, стаяла якраз на месцы вытоку з возера.

Гісторыкі пэўныя, што возера было досыць плыткае і вельмі рыбнае. Багацце рыбы і птушкі і прывабіла сюды старажытных людзей.

У нашым уяўленні чалавек каменнага веку, галодны і стомлены працай, туліўся ў сваёй зямлянцы і не ведаў, як выжыць. Але археолагі абвяргаюць гэта. Паводле словаў Максіма Чарняўскага, старажытныя людзі трацілі значна меней часу на пошук харчавання і працу, чым мы. З такой колькасцю рыбы ў вадзе, з той колькасцю дзічыны і раслінаў ім патрабавалася гадзіны тры ў дзень, каб забяспечыць сябе ежай на сёння і нават трохі адкласці на зіму.



Абед археолагаў. На стале ляжыць чэрап мядзведзя, які жыў пяць тысяч гадоў таму. Мяркуючы па сточаных зубах, гэта быў мацёры мядзведзь.



**Крывінскі тарфянік**

Першая стаянка на Крывінскім тарфяніку была выяўленая ў 1934. З таго часу тут знойдзена 10 тарфянікавых паселішчаў. Найбуйнейшае — Асавец–2, выяўленае Міхасём Чарняўскім у 1966. З 2008 даследаваннем часткі гэтага помніка пачаў займацца таксама археолаг Максім Чарняўскі.

## Замест хлеба — вадзяныя арэхі

Напрыклад, падчас раскопак археолагі знайшлі парэшткі чыліма, які вырас тысячы гадоў таму. Чылім — вадзяны арэх, на сцябліне расце па 5—12 арэшкаў. Яны растуць настолькі густа, што па іх не можа нават лодка прайсці, — як дыван на вадзе. Цяпер яны занесеныя ў Чырвоную кнігу. А ў каменным веку такіх арэхаў на возеры пад Асаўцом было безліч. Не сеяўшы і не араўшы, з аднаго гектара можна было «падняць» да трох тонаў арэхаў.

«На поўначы Беларусі вельмі позна з'яўляецца земляробства. Чылімы, думаю, былі адным з фактараў, якія адтэрмінавалі яго з'яўленне, — лічыць Максім Чарняўскі. — З арэхаў атрымлівалася цудоўная мука для своеасаблівага хлеба. Калі ў нас сам сабой расце хлеб у вадзе, то навошта нам чысціць поле, сеяць зерне, даглядаць, ганяць жывёлаў адтуль, калі мы можам гэта проста ўзяць?»

## Жалейка з косткі бусла

Старажытныя людзі трацілі ўсяго пару гадзінаў на здабыццё ежы. Увесь астатні час яны маглі прысвячаць выхаванню дзяцей і развіццю сваёй духоўнай і матэрыяльнай культуры. Археолагі знаходзяць у Асаўцы мноства касцяных і рагавых падвесак. Найбольш — з зубоў драпежнікаў (ваўкоў, лісаў, мядзведзяў). Лічыцца, што старажытны чалавек насіў каралі з зубоў, каб пераняць якасці жывёлаў. Прынамсі, так робяць сённяшнія плямёны, якія знаходзяцца на падобным узроўні развіцця.

Што мы дакладна можам упісаць у характарыстыку протабеларуса з Крывінскіх тарфянікаў — дык гэта любоў да музыкі. На самым пачатку раскопачнага сезону археолагі знайшлі самую старажытную беларускую жалейку — трубачку з галёнкі ці то бусла, ці то чаплі, з трыма дзірачкамі. Такія жалейкі — часам у горшым стане, часам горшай якасці — і раней трапляліся тут Чарняўскім. Магчыма, мяркуе спадар Максім, яны былі часткамі нейкага складанейшага музычнага інструмента, накшталт гармонікі Пана. Гэтаму пакуль няма доказаў. Але цяжка ўявіць сабе, каб людзі, маючы, такія жалейкі, ды не паспрабавалі іграць разам. Часу на рэпетыцыі яны мелі дастаткова. Вось і маем месца ўзнікнення першага беларускага музычнага калектыву. І час — пяць тысяч гадоў таму. Знойдзеная сёлета прабабка ўсіх беларускіх жалеек выдатна захавалася. Археолагі з музыказнаўцамі паспрабуюць рэканструяваць яе, каб даведацца як яна гучала і якія паслядоўнасці нот магла выдаваць. Раптам выявіцца, што гэта нашы продкі прыдумалі джаз?

## «Такога няма нідзе ў Цэнтральнай Еўропе»

Кіруе працэсам раскопак пад Асаўцом патрыярх Міхась Чарняўскі, які займаецца археалогіяй ужо больш за сорак гадоў. Студэнты гістфака кожнага ўніверсітэта абавязкова павінныя праходзіць археалагічную практыку. «Некаторыя зусім маладзенькія, ад мамы-таты, ад ванны з пенай — і раптам тут. Мы прыязджаем — а тут у рост чалавека трава, — смяецца спадар Міхась. — На падрыхтоўчых занятках я апісваю, што тут будзе: балота да гарызонту, грымоты, аж зямля разрываецца, што тут будзе паліць сонца, будуць грызці авадні і прыбіральня будзе за кустом. Але тут будуць знаходкі, якіх няма болей нідзе ў Цэнтральнай Еўропе...»

Ілітаральна за гадзіну да прыезду журналістаў «НН» у Асаўцы была знойдзеная яшчэ адна ўнікальная рэч. Студэнтка-першакурсніца Таццяна Зайцава адкапала касцяную іголньіцу — чахольчык з трубчастай косткі з дзвюма касцянымі шыламі ў ім. Максім Чарняўскі трохі ўзрушаны знаходкай, хавае яе ад сонца і акуратна паказвае нам: «Такія іголньіцы сустракаюцца, канечне, і на паселішчах Крывінскага тарфяніка, і ў Прыбалтыцы, і ў Расіі. Але выпадак, каб яна была разам з інструментам, які ў ёй захоўваецца... Відаць, гаспадыня яго проста згубіла. Паклала і забылася, дзе».

Іголньіца з шыламі завалілася і згубілася, а мы праз стагоддзі знайшлі яе, каб адчуць гэтае зафіксаванае дзеянне і на хвіліначку дакрануцца да жыцця тых, чый прах даўно развеяўся над гэтымі тарфянікамі.

**Настасся Шамрэй**

# «Трэба прыраўняць металашукальнікі да зброі»

Як спыніць чорных капачоў, што знішчаюць нашу спадчыну? Прапанова **Міхася Чарняўскага**.

**«НН»: Ці шмат у Беларусі археолагаў?**

**МЧ:** Усяго прафесійных археолагаў, можа, чалавек сорак. Таму мы даследуем мізэрную частку нашай спадчыны, яна ў значнай ступені разбураецца. У прыватнасці, у пасляваенны час прыблізна 50% нашых археалагічных помнікаў знішчана і пашкоджана. Уяўляеце бібліятэку старажытных рукапісаў і кніг, у якой 50% летапісаў знішчана?

У нас нават у абласных музеях няма археолагаў-спецыялістаў, не кажучы ўжо пра раённыя, а цяпер столькі будуюць. Існуе закон, што перад кожным будаўніцтвам павінныя весціся археалагічныя раскопкі. А археолагаў мала. І яны капаюць толькі на кар'ерах і вадасховішчах. Археалогія — навука фундаментальная, але сёння яна нават у горшым стане, чым была трыццаць гадоў таму. Тады было больш грошай, бензін быў танны, як вада, можна было машыну наняць і месяц ездзіць у разведках, глядзець, як там жывуць курганы і паселішчы. А цяпер невядома, што там робіцца. Разбураюцца, напэўна.

**«НН»: Таму вам і «дапамагаюць» чорныя капачы?**

**МЧ:** Гэта абсалютная зараза. Марадзёраў гэтых — некалькі тысяч. Я ведаю бізнэсоўцаў, якія займаюцца гэтым «купі-прадай». Яны прадалі свае шапікі, купілі за 2—3 тысячы даляраў металашукальнікі і зарабляюць грошы. Наша спадчына прадаецца не нам, у нас няма багатых бізнэсоўцаў, а ў Расію, Польшчу, Прыбалтыку.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Войны, акупанты з усіх бакоў знішчылі амаль усё, што ў нас на паверхні (замкі, касцёлы і г.д.). Што акупанты не дарабілі, знішчылі камуністы. Уся наша гісторыя ляжыць цяпер у зямлі. Тое, што вы бачыце ў музеях, не прыйшло да нас з XIX стагоддзя, бо музеі былі вывезеныя і разрабаваныя. Усё, што вы бачыце, археолагі знайшлі ў зямлі. Да гэтага часу яно зберагалася, а цяпер новыя ўнутраныя акупанты, марадзёры гэтыя, купілі металашукальнікі і выдзіраюць нашу гістарычную спадчыну, каб прадаць. Гэта жахліва. Мяне дзівіць, чаму дзяржава на гэта глядзіць скрозь пальцы.

**«НН»: Што можа зрабіць дзяржава?**

**МЧ:** Гэта ж элементарна: выдаць указ, прыраўняць металашукальнікі да зброі. Хочаш мець — зарэгіструй. Хочаш даследаваць нейкае поле — вазьмі дазвол, знайдзі старажытныя манеткі ці меч, здай дзяржаве. Хай яна заплаціць грошы. Калі ёсць дублі, то аддасць для калекцыі. А ў нас не засталося амаль ніводнага кургана, дзе няма ямак, выкапаных гэтымі людзьмі. Выдзіраюць самае каштоўнае. Гліняны гаршчок знайшлі і выкінулі, а побач ляжыць спражка бронзавая. Па тым, дзе знойдзеная спражка і што ляжыць побач, можна дакладна датаваць рэчы. Яны гэтую спражку выдзіраюць, і назаўтра яна ў Пецярбургу. Так сплывае з нашых рук спадчына.

**Гутарыла НШ**

# Поле цудаў




**Фота з серыі Артура Вакарава Wonderland, прысвечанай ждановіцкай барахолцы.**

На мінскай барахолцы можна купіць і кулямётную стужку, і парнаграфію, і бел–чырвона–белыя кукарды. Піша **Юрась Ускоў**.

Слава «поля цудаў» на Ждановічах разнеслася далёка за МКАД. Я ў гэтым пераканаўся, калі адзін украінскі знаёмы пытаў мяне, ці не купіў бы я там яму каўпакі ад «мерсэдэса».

Дабірацца да галоўнай беларускай барахолкі трэба праз увесь рынак «Ждановічы» — таму шмат хто паспявае купіць усё патрэбнае яшчэ там, і на «поле» ідзе толькі па зусім ужо рэдкія рэчы ці па вельмі нізкія кошты (нішто так добра не ілюструе формулу «цана — якасць», як барахолка). Сярод гандляроў у асноўным тыя, хто распрадае ўласную маёмасць: шмат пенсіянераў, беспрацоўных, ёсць бамжы, якім і гандляваць амаль няма чым, а ёсць (і даволі шмат) тых, для каго перапродаж старых рэчаў — прафесія. І, вядома, хапае відэа- і аўдыёпіратаў, якія зазываюць пакупнікоў патройным слоганам: «Фільмы! Серыялы! Парнаграфія!»

## Самыя папулярныя тавары

Гэта бензапілы (часам іржавыя), вайсковая форма ўсіх памераў і сезонаў, нашыўкі, якія вар'юючца ад «ФСБ» да «Узброеныя сілы» з бел-чырвона-белым сцягам, пагоны.

— Арыгінальныя?

— Ну ясна!

— А адкуль яны ў вас?

— Бел-чырвона-белая — мая. Астатняе — ад сваякоў і сяброў. «ФСБ» знаёмы прывёз, дзе ўзяў — не ведаю.

Надзвычай шырокі і выбар самавараў усіх мадыфікацый — іржавыя электрычныя, што даўно страцілі форму (за дзесяць тысяч), і нейкі ўнікальны самавар XIX стагоддзя з цэннікам «600 у.е.», прычым гандляроў ля гэтай гістарычнай каштоўнасці так і не знайшлося. Тамсама прадаюцца «сякеры 20-х гадоў», якія для дваццатых гадоў выглядаюць надта новымі.

Яшчэ адзін папулярны тавар — мабільныя тэлефоны: любых мадэляў і любых цэнаў. Адразу ж задумляешся, адкуль яны ўзяліся — трыццаць штук розных мадэляў, і бачна, што не новыя. Каштуюць ад 25 да 150 тысяч. Незалежна ад маркі і мадэлі.

— Чаму так дорага?

— А колькі, вы думаеце, яны каштуюць?

— А яны з паперамі, з гарантыяй, з упакоўкай?

— Не, канечне. І увогуле, браць будзеце ці не?

— А дзе вы іх узялі?

— Ой, адчапіцеся. Не перашкаджайце працаваць.

Ніводны з прадаўцоў так і не адказаў, адкуль ён бярэ апараты. Толькі адзін сказаў, што прадае свой стары. За дзесяць тысяч, на запчасткі.

## Савецкае мінулае

— Колькі за Леніна хочаце?

— За якога? У мяне іх чатыры штукі.

Насамрэч, не даводзілася раней бачыць: на брудным дыванку, сярод напаўіржавых шрубоў, драўляных мядзведзяў, старой біжутэрыі, стаіць адразу некалькі Ільічоў.

— Ну, а колькі кожны?

— Вось гэты, — прадавец паказвае на бюст вельмі сціплых памераў, — пацягне на 180 тысяч. А вось гэты, — мужчына паказвае на статуэтку сантыметраў трыццаці, — вось ён за 300. Калі дорага, купіце Дзяржынскага ці Бухарына — яны таннейшыя.

Нешта мяне грызуць сумневы, ці можа гэта быць Бухарын — усё ж такі вораг народа, але спрачацца і перапытваць у прадаўца не даводзіцца — ён упэўнены, што я з яго здзекуюся і ніводнага з Леніных не вазьму. Прынамсі ў апошнім мае рацыю. І нават Дзяржынскага, які хоць і серабрыстага колеру і амаль новы. У наступным шэрагу ляжаць кнігі. На самым бачным месцы — трэці том збору твораў Леніна, а ля яго нейкая кніжка ў мяккай вокладцы — такіх шмат выпускалі ў дзевяностыя — з назвай «Пласкавокая пачвара». Ля іх ляжыць двухтомнік памерам з дзве а то і тры цагліны: «КПСС у рашэннях і рэзалюцыях», выданне сёмае.

— Колькі за КПСС?

— Вельмі танна. Усяго пяць тысяч. За кожны том. Вы так танна яе больш нідзе не знойдзеце — у букіністах яна трыццаць каштуе.

— І што, бяруць іх?

— Што вы дурасць пытаецеся — канечне, бяруць.

Наступны гандляр спецыялізуецца на нумізматычных каштоўнасцях, самы ходавы тавар — царскія рублі. А таксама значкі кшталту «Памір», «Гатовы да працы і абароны». Пра царскія рублі і капейкі ён адказвае каротка: «Дорага». Затое значак «Пераможца сацыялістычных спаборніцтваў» ацэньвае ў дзве тысячы. Як высвятляецца, не адзін я цікаўлюся савецкай атрыбутыкай, мужчына ля мяне доўга корпаецца ў пакеціку з капейкамі і металічнымі рублямі.

— За колькі два рублі аддасі?

— За рубель...

Нумізматы тут цікавяцца іншым — толькі ў аднаго на ўвесь рынак ёсць адразу дзесяць двухдаляравых купюр — рарытэт, які «прыносіць удачу». Не ведаю, як удачу, а грошы гаспадару ён прыносіць дакладна: менш чым за дваццаць даляраў яго не купіш.

## «Купіце кулямётную стужку»

Дэфіцыт на полі цудаў — колы для дзіцячых калясак, іголкі для прайгравальнікаў вінілу, а таксама драты для савецкай тэхнікі. Колы ад калясак яшчэ сям-там мільгаюць, але дзе яны былі знойдзеныя — страшна нават падумаць, мяркуючы па іх стане. Іголкі ёсць толькі ў адным месцы, вельмі дзіўным. На самым ускрайку рынку стаіць адзінокі «Запарожац», ля яго сямейная пара гандлюе тым, «што знайшлося»: абавязковы самавар, цэлы набор шрубоў, а таксама тое, што калісьці было радыётэхнікай. Два прайгравальнікі танных класаў, з якіх з мясам выдраныя рэгулятары гучнасці і ўсяго астатняга. Зверху яны прысыпаныя пяском — відаць, вецер нанёс. Выглядаюць як археалагічныя знаходкі. Кожны каштуе сем тысяч — чаму так шмат? Бо ў іх ёсць іголка! Насамрэч вы купляеце іголку — а яна, дарэчы, падыходзіць толькі да тэхнікі гэтай жа мадэлі.

— Бярыце, усё адно іншых не знойдзеце. А гэты можна яшчэ наладзіць, — цікава, ці верыць сам гаспадар у гэта. — Можаце вунь магнітафон узяць.

Аказваецца, вось гэта скрыня з дратамі і мікрасхемамі ва ўсе бакі — магнітафон.

— Не. Дзякуй.

— Тады вазьміце кулямётную стужку, — гандляр паказвае на нейкую скрыначку. — Усяго за пяць тысяч.

— Кулямётную стужку?!

— Так. Бярыце, нідзе такой не знойдзеце. Хаця тут толькі каробка ад яе, але і каробку ад кулямётнай стужкі вы нідзе не знойдзеце. У мяне яшчэ штых з вінтоўкі быў, але ўжо купілі.

## У нас і за мяжой

Скажам шчыра, «поле цудаў» па духу блізкае да еўрапейскіх барахолак. Нямецкія фломаркі — блышыныя рынкі — таксама збіраюць у выходныя людзей, якія імкнуцца прадаць старыя рэчы. Там таксама можна знайсці зашмальцаваную саколку, трэснуты кубак, насадкі для электрапілы, і яны таксама будуць іржавымі. Там таксама ёсць людзі, якія не прапускаюць ніводнага фломарку, а ёсць і тыя, хто саромецца туды хадзіць (апошніх, дарэчы, шмат сярод нашых эмігрантаў). Аднак спецыфіка ў беларускай барахолкі ўсё ж такі ёсць: гандляры шчыра ганарацца сваім таварам, самавар гэта за 600 даляраў ці спраўны грамафон, старое дзесяцілітровае вядро ці пржавелая мясарубка. Нашым гандлярам проста бракуе прастаты, а замінае звышсур'ёзнасць. Хаця ёсць на «поле» адзін прадавец, які ўвесь час грае на акардэоне, і, што дзіўна, калі спытаць, колькі каштуе інструмент, ён адкажа: «Не прадаецца. Гэта я так, для душы».

## The Rolling Stones: сыход на пенсію як нагода прыехаць у Мінск



Гурт The Rolling Stones абвесціў пра сыход на заслужаны адпачынак. Пра гэта паведаміла брытанская газета Sun. Нядзіва: самаму маладому з «ролінгаў», Роні Вуду, споўнілася 63, а бубначу Чарлі Уотсу — ажно 69. Міку Джагеру і Кіту Рычардсу — па 68. «Мік Джагер ніколі не дажыве да тых гадоў, на якія ён цяпер выглядае», — жартуюць самі музыкі.

У дадатак, аўтары хітоў Brown Sugar, Angie, Satisfaction абвесцілі, што па-англійску яны развітвацца не збіраюцца, і дадалі, што вялікі развітальны тур на наступны год свету забяспечаны. Мо заедуць і ў Мінск?

The Rolling Stones — брытанскі гурт, заснаваны ў 1962. Дзякуючы рэвалюцыйным спевам, іміджу няскораных бунтароў і нахабных свавольнікаў, назва гэтага гурта даўно зрабілася хадзячай назвай рок-н-ролу.

**ЛК**

ПРЭМ'ЕРА

## «Офіс» у Купалаўскім

Апошняя прэм'ера гэтага сезону ў анонсе пазначаная як «бесхрыбетнасць у адной дзеі».

Гэта п'еса нямецкай пісьменніцы Інгрыд Лаўзунд пра будзённыя прыгоды «офіснага планктону». Тут пануе сістэма лютага кантролю, жалезабетоннай іерархіі. Гэта смех з нясмешных жартаў толькі таму, што іх расказвае начальнік, прысвячэнне ладнага кавалку часу гонцы за годнай пасадай і зрынанню канкурэнтаў. Тут пануе сістэма, што знішчае асобу і асабістасць.

— «Офіс» — паўабсурдысцкі спектакль пра людзей, пазбаўленых роўнай паставы, — кажа рэжысёр-пастаноўшчык Кацярына Аверкава. — Досыць з'явіцца адносінам «начальнік—падначалены», як дзенідзе людзі забываюцца на простыя ісціны, на каханне і сяброўства.

«Офіс» — сучасная п'еса, дзе сюжэт развіваецца нелінейна. Гэта хутчэй набор скетчаў, сцэнак, падчас якіх стваральнікі спектаклю на ўласнае разуменне раскрываюць выразы кшталту «нож у спіну», «на ім твару няма».

У спектаклі занятыя Святлана Анікей, Арцём Бародзіч, Дзмітрый Есяневіч, Міхаіл Зуй, Аляксандр Малчанаў, Павел Харланчук, Ганна Хітрык.

Наступны паказ — 28 ліпеня ў нязвыклым месцы — на Малой сцэне канцэртнай залы «Мінск». Бо, нагадаем, сёлета пачнецца рэканструкцыя будынка тэатра.

**Павал Касцюкевіч**

## Сціcла

- **Памёр стваральнік стужкі «Белыя росы».** Рэжысёра Ігара Дабралюбава не стала 21 ліпеня, на 77-м годзе жыцця. Яго пахавалі на Усходніх могілках Мінска. Першую кароткаметражную стужку «Мост» па ўласным сцэнары ён зняў у 25 гадоў. Затым былі карціны «Па сакрэце ўсяму свету», «Плач перапёлкі» па рамане Чыгрынава. Але найбольш Дабралюбаў запомніўся «Белымі росамі». У нерэалізаваных задумах рэжысёра застаўся мастацкі фільм па творах Быкава.
- **Ялфімаў заваяваў пяць медалёў.** На Сусветным чэмпіянаце выканальніцкіх відаў мастацтва ў Лос-Анджэласе добра выступіла беларуская каманда. Пётр Ялфімаў атрымаў пяць залатых і срэбны медаль. 15-гадовая вакалістка Дзіяна Громава з Гомеля — два залатыя і бронзавы, ансамбль «Палеская зорачка» — тры залатыя. У чэмпіянаце удзельнічалі прадстаўнікі 52 краін.
- **У Лепелі паставяць помнік Сапегу.** У 1586 Леў Сапега заснаваў мястэчка Белы (або Новы) Лепель, куды быў перанесены гандлёвы цэнтр, а таксама пабудаваныя замак, царква і касцёл. Так пачалася гісторыя сучаснага Лепеля. 11 верасня на Дзень горада помнік Сапегу паўстане ля ўваходу ў гарадскі парк.
- **У Мінскай прыватнай кінашколе здымаюць падлеткавы серыял.** Ён называецца «ЛунАрыКум» і складзецца з 24 серый. Таксама здымаецца 4-серыйная фантастычная стужка «Анёлы адлюстраванняў».

**СМ; КМ**




# Вуай-шан хао

**Аляксандр Апон.** Сатырычнае апавяданне.

Пасля таго як Кітай паабяцаў укласці ў эканоміку Беларусі 15 мільярдаў даляраў, а Расія паказала хвігу, Лукшэнку быццам даўбешкай па галаве стукнула.

— Вось што, хлопцы, — сказаў ён неяк, седзячы за вячэрай у цесным кружку сяброў-аднадумцаў (адзін з іх быў выдатны бізнэсовец, а другі — не менш выдатны хакеіст). — А Пазняк, бадай што, меў рацыю: ніякія мы не расійцы, а кітайцы.

Менавіта з гэтай хвіліны пачалася пагалоўная кітаізацыя нашай краіны. І першай галавой, выстаўленай у амбразуру, стала галава дыктаркі нядзельнай праграмы «Панарама». Дыктарка з'явілася на экране тэлевізара з гэтак падведзенымі вачыма, што яны здаваліся раскосымі.

— Вуай-шан хао! — сказала яна і, лыпнуўшы два разы доўгімі, як веера, вейкамі, салодка і лісліва па-кітайску ўсміхнулася.

Вуай-шан хао — добры вечар (кіт.)

«Во, на табе!» — разявіўшы рот, вылупіўся на яе я. І гэтак, з разяўленым ротам, лёг спаць.

Зрэшты, не я адзін. Напрыклад, мой кіраўнік аддзела ў Інстытуце гісторыі НАН, дзе я ўжо дзесяць гадоў падзвіжнічаў на ніве гістарычнай навукі. Назаўтра, як толькі я (па-ранейшаму з разяўленым ротам, які ў мяне не закрываўся хоць крыкам крычы) з'явіўся ў інстытуце, прафесар выклікаў мяне ў кабінет. І сказаў, зморшчыўшыся, як ад болю пад рэбрамі:

— Вось што, Аляксандр: я з сённяшняй раніцы не Іван Сяргеевіч Ханурkін, а Ван Сяхань.

— Як? — залыпаў я вачыма і нарэшце закрыў рот.

— Ага, так — Ван Сяхань, — сумна пацвердзіў ён, падышоў да мяне і, узяўшы за гузік на пінжаку, унурыўшыся ў падлогу, ціха, амаль інтымна, прамовіў:

— А ты з гэтай хвіліны не Аляксандр, а Ля.

— З чаго гэта раптам? — увесь пахаладзеў я.

— Не хачу я быць ніякім Ля! Мяне мама Сашам назвала, Аляксандрам!

— Што мама, — скрывіўся прафесар, — калі ўжо ёсць праграма «Дзесяць крокаў», якую зацвердзіў сам — тут ён тыцнуў пальцам у столь, — Ляо Лу.

— А хто такі Ляо Лу? — насмеліўся запытацца я.

— Ну як жа, — ускінуў ён на мяне спакутаваныя вочы. — Няўжо не здагадваешся?

— Не, — адмоўна хітнуў я галавой.

Прафесар кіўнуў на партрэт на сцяне кабінета, над пісьмовым сталом.

Я не знайшоў, што сказаць, толькі няпэўна паціснуў плячыма. Зрэшты, Ван Сяхань і не чакаў ад мяне ніякіх слоў. Пусціў гузік, які так і не здолеў адкруціць, узяў мяне пад руку, падвёў да аднаго з двух фатэляў, якія стаялі ля люстранога століка і, пасадзіўшы, сам сеў насупраць.

— Але чаму Ляо Лу, адкуль гэта ўзялося? — вымавіў я, чухаючы, як дурань, патыліцу

— Ну як жа! — дзівіўся маёй нездагадлівасці Ван Сяхань. — Ляо — гэта імя ад Аляксандра, ну а Лу...

— Пачакайце: як жа Ляо можа быць ад Аляксандра, калі я таксама Аляксандр, але не Ляо, а толькі Ля?

— А, вось што цябе засмучае! — тонка ўсміхнуўся прафесар. — «О» — гэта не проста «о» ў слове Ляо, а Ооо! — тут ён зноў падняў угару палец, — які чалавек!

— Вось у чым справа! — дайшло нарэшце да мяне. — Не, не хачу я быць ніякім Ля.

— Што ж, вольнаму воля, — панура, пагледзеўшы ў акно, сказаў прафесар, перайшоў на «вы» і запытаўся, буду я пісаць заяву аб звальненні па асабістым жаданні, ці ён звольніць мяне сам у сувязі са скарачэннем штату, ці ўсё ж я яшчэ крыху падумаю.

— Падумаю, — вырашыў я. Тым больш у мяне была такая важная і цікавая тэма дысертацыі, што кінуць яе я не меў маральнага права.

— Вось якраз наконт дысертацыі я цябе і выклікаў, — таксама прыгадаў прафесар. — У цябе ж «Асноўныя канцэпцыі паходжання беларускага этнасу»?

І моўчкі падаў мне цыркуляр з Адміністрацыі прэзідэнта. З тэксту, што ішоў ніжэй за пагрозлівы надпіс « Сакрэтна», я даведаўся, што канцэпцыю, згодна з якой продкамі беларусаў былі славяне і балты, належыць лічыць цалкам заганнай. І, выкінуўшы яе на сметнік як неадпаведную гістарычнай праўдзе, прыступіць да выпрацоўкі новай.

— А каго ж тады лічыць нашымі продкамі? — адарваўшыся ад паперы, дрыжачым голасам запытаўся я.

— Кітайскую народнасць гаў.

— Як!? Гаў? — жахнуўшыся, выцішнуў я. — Але прабачце, прафесар, гэта цалкам немагчыма: як жа яны да нас, гэтыя «гаў», трапілі?!

— Ну, як-як! — нервова перасмыкнуў ён плячыма. — Прыйшлі сабе...

— Як прыйшлі? За дзесяць тысяч кіламетраў?!

— Ага, за дзесяць. Спусціліся на нечым накшталт сноўбордаў з Гімалайскіх гор і пашыбавалі праз мангольскія стэпы да Урала, а тут ужо рукой было падаць... Таму старэйшым братам будзем лічыць кітайцаў і разам з імі, у адной сям'і, крочыць да светлага заўтра, якое ўжо не за гарамі, пад кіраўніцтвам нашага вялікага кормчага і Ооо! — тут ён зноў узняў угару палец, — якога чалавека! Зразумеў?

— Зразумеў, — хітнуў я галавой і, хістаючыся, пайшоў з кабінета прэч...

— Можа наліць чарачку каньяку ці выклікаць «хуткую»? — ледзь не плакала, стоячы нада мной увечары, жонка.

— Не, не трэба, — стагнаў я і толькі прасіў. — Вады!

Жонка ішла на кухню, дзе, пусціўшы з крана халодную ваду, мачыла ручнік, каб пакласці яго мне на гарачы лоб.

У «Панараме» дыктарка паведамляла, што прэзідэнт Ляо Лу правёў нараду ў Адміністрацыі на вуліцы Мао Цзэдуна, 38 па пытаннях бягучай палітычнай сітуацыі. Сярод іншага кіраўнік выказаўся па гэтак званых моўным пытанні, не забыўшыся прайсціся нагамі па пісьменніках.

— Дайце мне, дайце мне «Хуанлоўмын», ці, на горшы выпадак, «Саньгачжы ян'і» — запатрабаваў ён у пісьменнікаў і, прыціскаючы свае вялікія моцныя рукі да шырокіх грудзей, шчыра дадаў. — І я вам заплачу!

Друкуецца скарочана.

# Знакі прыпынку

**Уладзімір Някляеў.** Запісы.



* * *

Тэлефануе Наталля Шаранговіч і просіць напісаць успаміны пра Міколу Селяшчука. Выдавецтва «Мастацкая літаратура» выдае кнігу да ягонага юбілею.

Пытаюся: «Наталля, ты хіба не разумееш, што ніякіх маіх успамінаў у дзяржаўным выдавецтве ніхто не надрукуе?» Адказвае, што разумее, але ўспаміны ў кнізе надрукуюць. Яна пра ўсё дамовілася, ніхто не выкіне ні радка.

За радкі не чапляліся. Выкінулі тэкст з кнігі цалкам.

І болей не патэлефанавала мне Наталля Шаранговіч. Я б ёй сказаў: «Нічога, Наташа, такой бяды». Але яна не патэлефанавала.

* * *

Калі за савецкім часам рэдагаваў я бюлетэнь «Тэатральны Мінск», дык абавязаны быў прысутнічаць на так званых здачах спектакляў Міністэрству культуры. У той час любы спектакль трэба было з д а в а ц ь, каб займець дазвол, д о п у с к на сцэну — па меркаванню найперш ідэалагічных. На тых з д а ч а х было нямала момантаў даволі камічных...

Здавалася опера Рыгора Пукста «Аповесць пра сапраўднага чалавека». Актор, які выконвае ролю Аляксея Мярэсьева, паўзе па сцэне і пяе: «О, колькі дзён паўзу я — ні кроплі ў роце не было...» І адразу ўступае хор: «Гангрэна! Гангрэна! Яму адрэжуць ногі!..»

Я не вытрываў, засмяяўся.

На абмеркаванні оперы інструктар аддзела культуры ЦК КПБ (здаецца, прозвішча ягонае было Парватаў) спытаў, што я ў гераічным творы ўбачыў смешнага. Я адказаў. І нейкая дама з Міністэрства культуры адразу абурылася: «Чалавеку ногі адразаюць, а яму смешна!..»

Спектакль прынялі. Ідэалагічным патрабаванням ён адпавядаў цалкам.

* * *

Тры дні (12—14.12.08) — на беларуска-польскім літаратурным семінары «Бязмежжа», у 12-ты раз арганізаваным няўрымслівым Яўгенам Вапам. «Такіх людзей ужо няма і хутка зусім не будзе» — гэта пра яго.

Завёз ён нас (з Мінску былі Барыс Пятровіч, Алесь Пашкевіч, Міхась Скобла ды Алена Макоўская) на хутар пад Нараўку (агратурыстычную гаспадарку «Бора-Здруй» у Новым Ляўкове), дзе гаспадары Казлоўскія (насамрэч ГАСПАДАРЫ, бо і паднялі ўсё, і цягнуць усё самі, сваёй сям'ёй) усіх гасцей сваіх смачна (бабкаю ў кішках, якую забыўся я, калі смакаваў) кормяць і соладка (жытнёўкаю) пояць. А гаспадар Барыс яшчэ і сам малюе, і сам на гармоніку грае, і сам свае анекдоты расказвае...

На літаратурных чытаннях найбольш глянуўся Міхась Андрасюк з ягонай мяккаўсмешлівай (у нечым блізкай да памежна-правінцыйнай кінастылістыкі Кустурыцы) прозай. Значна лепшымі за сябе ранейшых выглядалі Міра Лукша і Віктар Стахвюк. Слаўнае дзяўчо Ілона Карпюк, якая і спявае, і кіно здымае (даволі пранізлівы фільм пра родную вёску, якая вымірае).

Карацей, хоць і вымірае, але ўсё ж дыхае, жыве яшчэ Беларусь на польскім боку Белавежы, і не адзін Сакрат Яновіч (якога я з 1999 году не бачыў і які ў Нараўку, на жаль, не прыехаў) — беларус на Беласточчыне. Ва ўсякім разе, не ён апошні.

## АНДРУСЬ ХРАПАВІЦКІ

МАЙГО КАНДЫДАТА ПАДТРЫМЛІВАЮЦЬ МАРСІЯНЕ

Майго кандыдата падтрымліваюць марсіяне
Таму я ўпэўнены, выбары пройдуць чотка
У нас усё будзе спакойна, не так, як у Кыргызстане
Мы возьмем уладу тэлепатычнымі сродкамі

Зялёныя чалавечкі зоймуць пасады ва ўрадзе
Наш «зайчык» за год даляр і еўра абскача
Мы ўступім у НАТА, за месяц памірым ЗША і Багдад
Мядзведзеў не будзе ў нас паводзіць сябе як «мачо»

Літоўцы й палякі вывучаць беларускую мову
Захочуць назад у Вялікае Княства з цэнтрам у Менску
Грыбаўскайце прозвішча зменіць на Грыбалёву
І будзе даводзіць, што ўмее спяваць эстрадныя песні

Майго кандыдата падтрымліваюць марсіяне
Жыхары чырвонай планеты — нашы сябры спрадвеку
Не верыш? Паверыш у гіпнатычным дурмане!
Наперадзе толькі свабода і зялёныя чалавечкі



**Андрусь Храпавіцкі**
кампутарнік, інтэрнэт-выдавец. Жыве між Глыбокім і Вільняй.

# Улады Томскай вобласці Расіі выдаткавалі на «беларускія хаткі» $ 3 тысячы і 50 кубаметраў лесу

**Культурніцка–адукацыйныя цэнтры беларускай дыяспары з'явяцца ў Томску і ў вёсцы Манастырка Шагарскага раёна Томскай вобласці.**

У часы сталыпінскіх рэформ беларусы заснавалі некалькі вёсак ля Томска, тагачаснай сібірскай «брамы».

Яшчэ цяпер на пярэстай этнічнай карце Томскай вобласці гэтыя мясціны — Шагарскі раён — вызначаюцца як заселеныя выхадцамі з Беларусі. Самая буйная з былых беларускіх вёсак і адначасова мясцовы адміністрацыйны цэнтр, Манастырка, размяшчаецца на беразе ракі Об за сотню кіламетраў ад Томска.

Яна не была ўласна заснаваная беларусамі, але стала буйною менавіта дзякуючы хвалі перасяленцаў з нашых земляў. Побач з Манастыркай загубіліся ў тайзе яшчэ некалькі невялічкіх пасяленняў — Федараеўка, Міхайлаўка, Мікалаеўка, Пакроўка, — што маюць «беларускія карані». Гэтая апошняя адметнасць сёння не дужа кідаецца ў вочы, пасяленні мала розняцца ад іншых таёжных вёсак. Паўныя беларускія рысы, аднак, можна знайсці. Нашчадкаў тых перасяленцаў выдаюць выразны акцэнт, нетыповыя для сібіракоў інтанацыі ў размове.

Аднак беларускасць той жа Манастыркі — лёгкі цень, водгук, што распускаецца вось ужо цягам стагоддзя. Падчас апытання, праведзенага ў мясцовай школе, з шасцідзесяці вучняў толькі восем адказалі, што маюць беларускія карані. Мова, культура, традыцыйныя рамёствы забытыя амаль цалкам.

Нацыянальна-культурная аўтаномія беларусаў Томска зараз мае павярнуць гэты працэс. Арганізацыя, на чале якой стаіць ініцыятыўная і ўплывовая ў сваёй сферы (яна дырэктарка дома дзіцячай творчасці) Любоў Адаскевіч, за апошнія гады заўважна ажывіла дыяспару. Штогод тут праводзіцца міжнародны фестываль беларускай культуры, гасцямі якога былі і госці з Радзімы — ансамблі «Неруш», «Радуніца».

У Томску створаныя аматарскія ды паўаматарскія калектывы — жаночыя ансамблі «Крылы» (хоць гэта і няправільна, але націск тут прывыклі ставіць на апошні склад) і «Медуніца», мужчынскі ансамбль «Лявоны» і дзіцячы — «Праменьчыкі». Тройчы яны выступалі з народнымі песнямі ў Беларусі — у Доўску, Рагачове, Мінску. Наладжаныя кантакты з пасольствам Беларусі, якое гатовае забяспечыць томскіх беларусаў кніжкамі для вывучэння мовы, літаратуры і гісторыі.






**Дзед Васіль Родзік — сын перасяленцаў з Беларусі, жыве ў Манастырцы. Не быў у Беларусі ані разу, але добра гаворыць па-беларуску, моцна тужыць па Радзіме.**

Сёлета аўтаномія атрымала грант ад Дэпартамента па культуры Томскай вобласці на стварэнне ў Манастырцы «беларускай хаткі». Яна размесціцца ў цэнтральным адміністрацыйным будынку вёскі, пад адным дахам з аптэкай, пасялковым саветам і пастарункам. Грошы выдзеленыя невялікія — 90 тысяч расійскіх рублёў (каля 8 млн 800 тыс. беларускіх), але дапамагчы ў абсталяванні «хаткі» абяцаў таксама кіраўнік Паўночнага сельскага пасялення Аляксандр Баймукашаў. Ён выдзеліў на афармленне памяшкання 50 кубаметраў лесу.

Л. Адаскевіч разлічвае, што надалей удасца атрымаць стаўку для бібліятэкара альбо наглядчыка, каб на базе «хаткі» можна было стварыць культурна-адукацыйны цэнтр з бібліятэкай і пастаяннымі заняткамі.

«Хатка» будзе аздобленая ў этнаграфічным стылі: з ткацкім станком, печкай, покуццю і калодзежам-жоравам пад вокнамі. Падобная «хатка» з'явіцца і ў Томску ў памяшканні дома дзіцячай творчасці «Паходня». Работы, да якіх прыцягнутыя томскія мастакі, мусяць завяршыцца да наступнага фестывалю беларускай культуры, што пройдзе тут у лістападзе.

**Аляксей Бацюкоў, Томск—Магілёў**



**Пляж Маха (Maho Beach) знаходзіцца ў нідэрландскай частцы вострава Св. Марціна, што належыць да Малых Антыльскіх выспаў у Карыбскім моры. Пляж унікальны тым, што размешчаны побач з міжнародным аэрапортам імя прынцэсы Юліяны, і самалёты заходзяць на пасадку проста над галовамі адпачывальнікаў.**

## У чарнаскурай пары нарадзілася белая дачка

**Дактары кажуць, што з бацькоў пажартавалі гены: «белы» ген можа хавацца пяць пакаленняў і толькі пасля праявіцца.**




Блакітнавокая бялявая дзяўчынка нарадзілася ў сям'і Бенджаміна і Анжэлы Іхегбара. Бацька прызнаўся, што калі ў першы раз убачыў немаўля, то не стрымаў воклічу здзіўлення і адразу заявіў, што гэта не яго дзіця. Аднак затым ён усё ж такі прызнаў сваяцтва. «Мая жонка верная мне, але нават калі б гэта было не так, то дзіця б выглядала па-іншаму», — пажартаваў Іхегбара.

«Яна проста цуд!» — дадае яго жонка. У пары ёсць яшчэ чарнаскурыя дачка і сын. Дзеці доўга не маглі прызвычаіцца да таго, што цяпер у іх ёсць белая сястрычка.

Лекары запэўніваюць, што дзіця — не альбінос, яна цалкам здаровая. Проста ў некага з бацькоў ёсць ген белай скуры. Муж і жонка здзіўляліся — у іх у родзе няма белых, самі яны пераехалі ў Вялікабрытанію з Нігерыі толькі пяць гадоў таму. Аднак медыкі запэўнілі іх, што ген можа драмаць пяць пакаленняў. Верагоднасць такога — адна на мільён.

**АП паводле замежных СМІ**

КЛІМАТ

## Праз гарачыню змялелі рэкі

На рэках адзначаецца зніжэнне ўзроўню вады з сутачнай інтэнсіўнасцю 1—5 см. На працягу найбліжэйшага тыдня спад вады працягнецца. На Дзвіне каля Суража і Піне каля Пінска ўзроўні вады наблізяцца да небяспечна нізкіх адзнак для суднаходства. Дзвіна каля Віцебска, Дняпро каля Жлобіна і Сож каля Гомеля ўжо сплытчэлі. Затое плаваць — адна асалода. Вада ў азёрах і рэках нагрэлася да 23—27°С.

**БелаПАН**

КУР'ЁЗ

## 500 еўра за пацалунак у машыне

А за пацалунак на лесвічнай пляцоўцы — 100. Абсурдныя забароны, што дзейнічаюць у Італіі, выцягваюць грошы з неабачлівых турыстаў.

На некаторых пляжах у Рыме забаронена выкопваць ямы ў пяску і будаваць замкі. Ля лагуны накладаюць штраф за кармленне галубоў. На папулярным сярод турыстаў востраве Капры забаронена грукаць па дарозе драўлянымі сандаламі. Месцамі дзейнічаюць забароны на вывешванне мокрых ручнікоў на балконах. Гэтым летам на 500 еўра аштрафавалі юнака, які апоўначы рухаўся з куфлем піва праз цэнтр горада.

Мэрыі Рыма, відаць, прыемна штогод выдумляць новыя сродкі папоўніць гарадскую казну і загрузіць працаю супрацоўнікаў паліцыі. На сённяшні момант налічваецца звыш 150 «мясцовых парадкаў». Складанасць накладае няведанне новаўведзеных прадпісанняў як мясцовымі жыхарамі, так і турыстамі.

**Юльян Місюкевіч паводле «Шпігеля»**

ЧАЛАВЕК І ПРЫРОДА

## Глыбачанін атрымаў 350 тысяч штрафу за здзек з птушкі



27 ліпеня Глыбоцкі раённы суд разгледзеў адміністрацыйную справу чалавека, які мучыў птушку. Глыбачанін атрымаў пакаранне ў 10 базавых велічынь (350 тысяч рублёў). Віну сваю ён прызнаў і пайшоў плаціць штраф.

Нагадаем, 30 мая адзін з жыхароў вул. Паўднёвай у Глыбокім злавіў галку і зрабіў з яе «жывое пудзіла» — прывязаў да шаста на гародзе. Птушка торгалася і крычала. Гэта заўважылі суседзі і патэлефанавалі ў інспекцыю па ахове жывёльнага і расліннага свету. Супрацоўнікі інспекцыі прыбылі на месца, вызвалілі галку і склалі пратакол.

**УС**

# Кінуць баявую сякеру і стрэліць з лука

**На тэрыторыі музейнага комплексу «Дудуткі» ад 31 ліпеня да 1 жніўня пройдзе фэст славы беларускай зброі «Наш Грунвальд».**

Пройдуць турнір лучнікаў, бойкі на мячах, турнея (гэтак па-старабеларуску называецца рыцарскі турнір) і паказальныя выступы вершнікаў: падыманне хусткі дзідай, ссяканне капусты і, вядома, класічныя двубоі).

Будуць і прыўкрасныя дамы ў сярэднявечных уборах.

«Мы ж пільнуемся прынцыпу: адзін бой — адзін танец, — кажа арганізатар фэсту Андрэй Захаранка. А ці ёсць лепшае месца для танцаў за вытаптанае рысталішча?»

На конны турнір заявак пакуль з дзясятак. Але, кажуць арганізатары, іх будзе больш. Сябры рыцарскіх гурткоў толькі-толькі паскідалі кальчугі пасля вяртання з грунвальдскага поля. Яшчэ пэўна не паспелі падсесці да кампутараў, каб пакінуць заяўкі на турнір.

Падчас фэсту «Наш Грунвальд» адбудуцца таксама бугурты, збройныя сутычкі па, так бы мовіць, спартовых дысцыплінах: «захоп караля», «штурм брамы», «сценка на сценку».

Дзякуючы ж зладзяць конкурс сярэднявечнага касцюма. Яго трэба будзе не толькі пашыць і прадэфіляваць у ім па сцэне, але яшчэ і апавесці публіцы, з якой эпохі ён пазычаны і якому стану належыць.

Будзе і музычная частка — зайграюць «Стары Ольса» і гурт ірландскай музыкі «Кейлі Кёл». Упершыню на фэсце выступяць тэатральныя калектывы.

«Мы паспрабавалі паказаць, што Грунвальд у прыватнасці і гістарычныя падзеі ўвогуле маюць і культурнае вымярэнне, — дадае А. Захаранка. — І таму запрасілі на фэст тэатральныя трупы, якія пакажуць пастаноўкі на гістарычную тэматыку, пра выбітных асобаў нашай мінуўшчыны».

Да Дудутак падчас фэсту будзе хадзіць спецыяльны аўтобус, а ля музея ўзнікне намётавы лагер. Кошты: 25 тысяч рублёў — дарослыя, 7 тысяч — дзеткі (на цэлы дзень).

**ЛК**




## ВЫСТАВЫ

### Фестываль у Залессі Агінскага

**7 жніўня ў маёнтку Міхала Клеафаса Агінскага, у вёсцы Залессе Смаргонскага раёна**, адбудзецца фестываль-кірмаш «Залессе запрашае сяброў». У праграме фестывалю: выстава-продаж вырабаў народных майстроў, экскурсія па маёнтку Агінскіх, канцэрт мастацкай самадзейнасці былых і цяперашніх жыхароў Залесся ды навакольных вёсак, а таксама гасцей з-за мяжы (Польшча, Літва, Латвія), танцавальны майстар-клас (вас навучаць першым крокам паланэза — вядомага ў даўніну танца!). Тут можна будзе пакаштаваць традыцыйныя мясцовыя стравы і напоі, навучыцца іх гатаваць, сфатаграфавацца з «уладаром маёнтка» Агінскім, заказаць свой партрэт у мясцовага мастака, набыць сувеніры з візітоўкай Залесся, дары Залескай зямлі: бульбу і гародніну, грыбы і ягады, мёд, малако і мясцовыя сыры, «свойскія» яйкі і масла… Вы таксама можаце ўзяць удзел у свяце, прывезці на продаж свае вырабы ці паўдзельнічаць у канцэрце (дамовіўшыся папярэдне з арганізатарамі). **Пачатак аб 11-й гадзіне.** Дадатковая інфармацыя і даведкі праз тэл. (029) 313-55-57.

### Грунвальд за смугою часу

600-гадовы юбілей Вялікай Перамогі прынёс новыя творы і новае таленавітае прачытанне дзвюх важных тэм у нашай айчыннай гісторыі. **У Літаратурным музеі Багдановіча (Багдановіча, 7а) да 1 жніўня** працуе выстава, прымеркаваная да гадавіны Грунвальду.

### Belart.by

**У Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва (пр. Незалежнасці, 47) да 8 жніўня** працуе графічная выстава «Belart.by. Маладыя мастакі Беларусі».

### Гіганты ледавіковага перыяду

**У Гістарычным музеі (Маркса, 12) да 29 жніўня** працуе выстава «Гіганты ледавіковага перыяду» з фондаў Дзяржаўнага музея гісторыі Санкт-Пецярбурга «Петрапаўлаўская крэпасць». Мадэлі жывёл для выставы адноўленыя па шкілетах даўніх вымерлых істот. Для гэтага выкарыстоўваліся сучасныя кампутарныя праграмы з трохмернай графікай. Экспанаты рухаюцца і могуць рыкаць!

### Chrysalis

**У галерэі «Ў» (пр. Незалежнасці, 37а) да 31 ліпеня** працуе выстава Надзеі Макеевай «Chrysalis», створаная паводле матываў апавядання Рэя Брэдберы «Пераўтварэнне». Апавяданне размяркоўваецца на 22 аркушах такім чынам, каб візуальна падкрэсліць кампазіцыйную змену тэксту, і падмацоўваецца шэрагам разнастайных аб'ектаў: фатаграфічныя калажы, інструменты і мадэлі коканаў.

## ІМПРЭЗЫ

### Дах-XI

**Да 15 жніўня ў Палацы мастацтваў** праводзіцца фестываль эксперыментальнага мастацтва «Дах-XI» пад назвай «Mageia Cerebrum» («Цёмныя таямніцы мозгу»).

## ТЭАТРЫ

**28 ліпеня**

**Тэатр імя Горкага** — «Пане Каханку»
**Купалаўскі тэатр** — «Тэатраманія»
**Купалаўскі тэатр** (Малая сцэна) — «Офіс»

**29 ліпеня**

**Купалаўскі тэатр** — Нясумны юбілей. Да 90-годдзя Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы

## КІНО

### Пачатак

**Inception**
ЗША — Вялікабрытанія, 2010, каляровы, 148 хв.
**Рэжысёр:** Крыстафер Нолан
**Ролі выконваюць:** Леанарда Ды Капрыё, Джозэф Гордан-Левіт, Элен Пэйдж
**Жанр:** Псіхалагічны трымценнік з элементамі фантастыкі
**Адзнака:** 7,5 (з 10)




Дом Коб — злодзей, які крадзе чужыя сакрэты, вандруючы ў сны. Але аднойчы Кобу прапануюць не скрасці ідэю, а пакласці яе ў чужы розум. Коб збірае каманду для небяспечнае аперацыі, але мала хто ведае, што галоўны вораг — у снах самога героя.

Закручаны трымценнік Крыстафера Нолана — найлепшая стужка летняга сезону.

Сны заўжды былі ўдзячнай метафараю кіно. У карціне Нолана яны дакладныя, рэалістычныя, без навязлівых дадатковых эфектаў. Гэта сны-трылеры са стралянінаю і пагонямі, бесперапынным дзеяннем і жорсткай псіхалагічнай гульнёй.

Леанарда Ды Капрыё і Марыён Катыяр, Кіліян Мэрфі і Кен Ватанабэ правальваюцца ў чужыя сны, б'юцца, высвятляюць адносіны. Развальваюцца гарады, падаюць машыны, імчацца снегавыя лавіны.

Сны ад Нолана не дадуць вам заснуць на працягу амаль трох гадзінаў.

Але будзьце асцярожнымі: рэжысёр-гіпназнаўца ўжо імплантаваў у вас сваю ідэю.

**Андрэй Расінскі**

# Якая-якая фатаграфія?

У мінскім Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва (Незалежнасці, 47) адкрылася выстава піктарыяльнага фота «Працяг». Яе ўдзельнікі — не з тых, што здымаюць на лічбавую камеру і адразу выстаўляюць свае творы ў сеціве. Тут мы маем справу з тымі, што робяць здымак і пачынаюць яго ўсяляк апрацоўваць: рознымі растворамі срэбра, медзі, золата, расфарбоўваючы і падмалёўваючы выяву, падкрэсліваючы адныя элементы і затушоўваючы іншыя.

Дакументальная аснова? Не мае вырашальнага значэння, бо з першых крокаў піктарыяльная, ці па-англійску «маляваная» або «карцінная» фатаграфія засяродзілася на атрыманні выявы, якая адказвае эстэтычным поглядам і памкненням аўтара. Дзякуючы гэтай адметнасці піктарыяльная фатаграфія пакрысе выпрацавала асабістую мову і яшчэ ў пачатку ХХ ст. зрабілася самастойнай мастацкай плынню.

Рамантычная атмасфера ранніх піктарыяльных фатаграфій была блізкая класіку беларускай, літоўскай і польскай фатаграфіі Яну Булгаку, а таксама Льву Дашкевічу, першаму вядомаму нам выкладчыку фатаграфіі ў Беларусі.

«Мне здаецца, што грань пошукаў сучасных прыхільнікаў піктарыяльнай фатаграфіі ў Беларусі сягае далёка за межы магчымага, але ўсе яны — працяг тых традыцыяў спагады, шчырага аповеду і чуллівасці да навакольнага свету», — кажа куратар выставы Альберт Цехановіч.

На выставе дэманструюць свае працы фотамастакі Маргарыта Трэніна, Альберт Цехановіч, Наталля Яўмененка, Аляксандр Птах і Андрэй Вазнясенскі.

На пытанне, нашто займацца мастацтвам, якое і не фатаграфія, і не жывапіс, самая маладая ўдзельніца выставы Марыя Банэ адказвае: «Мяне вабіць унікальнасць, бо такой фатаграфіі, якую я стварыла, не будзе больш ні ў кога. Апрацаваў яе і атрымаў часам нечаканы вынік, які моцна зачароўвае».

Выстава працягнецца да 1 жніўня.

**ЛК**



**Пачаткі беларускага піктарыяльнага фота. Ян Булгак. Вільня.**

# Адпачынак у Чарнагорыі: досыць аднаго разу

Я размаўляла па-беларуску. Мяне разумелі ўсе, хто хацеў зразумець.

На ўсіх сайтах пра Чарнагорыю пішуць як пра прыгожую краіну. Сапраўды, мора, горы, панарамы, вёсачкі, гістарычныя цэнтры ўражваюць. Краіна спалучае неспалучальнае. Тут пабачыш побач канадскую сасну і пальму.

Каб прыехаць, трэба набыць ваўчар, калі збіраецеся быць больш чым 30 дзён — візу. Калі ў турфірмах вы набываеце толькі білеты, некаторыя нават не пераймаюцца папярэдзіць пра гэта. Калі вярталася назад, ваўчар не пыталі. Праблемы падчас выезду ўзнікаюць у таго, хто мае дробныя правапарушэнні і не заплаціў штраф. Максімальная яго сума — 150 еўра.

У Чарнагорыю праз турфірму ехаць не варта. Лепш купіць авіябілеты, а там у любым горадзе можна зняць пакой (sobe), кватэру (apartamet) ці нумар у прыватным гатэлі. Цэны ад 5 да 50 еўра. Залежыць ад умоваў і адлегласці ад мора. Гатэлі найвышэйшага ўзроўню, вядома, будуць каштаваць даражэй. Самы «танны» горад для пражывання на ўзбярэжжы — Бар. Але ён лічыцца партовым, а не турыстычным. Будва больш цікавая для турыстаў. Індустрыя забаваў развітая слаба. Сэрвіс таксама не на найвышэйшым узроўні.

Але калі вы думаеце, што наведваеце еўрапейскую краіну, то глыбока памыляецеся. Тут дамінуе традыцыйная патрыярхальная культура. Калі пазнаёміцеся з чарнагоркай і захочаце запрасіць яе на спатканне, спачатку трэба будзе запытацца дазволу сваякоў. Не выключана, што на сустрэчу прыйдзе і нехта з іх. Паводзіны чарнагорскіх мужчын так не кантралююць.

Турысткі-славянкі прыцягваюць увагу чарнагорцаў, бо яны прывабнейшыя за чарнагорак. Чарнагорцы адразу цікавяцца ўзростам, прафесіяй, бацькамі, замужам ці не. Калі ён не жанаты, то размовы пра шлюб пачынаюцца ў першую гадзіну знаёмства. Скончыць адносіны складана. З першага разу мужчыны не разумеюць, што іх больш не хочуць бачыць. Можна выкарыстаць непрыстойныя словы.

Мясцовае насельніцтва даволі спецыфічнае. Тут побач ветлівасць у крамах, дапамога на дарогах у цяжкіх выпадках і адкрытае хамства і абраза.

Маёмасць каля мора прыцягвае заможных людзей з розных краін.



Дамінуюць італьянцы і расійцы. Прыемна, што сярод уладальнікаў нерухомасці ёсць беларусы.

Каму варта паехаць: аматарам вандровак і серпантынаў, тым, хто хоча схуднець і пазбыцца цэлюліту, сямейным парам. Тым, хто любіць камфорт, добрае абслугоўванне і забавы, не спадабаецца. Усё ў краіне можна пабачыць за 10 дзён. Узбярэжжа перасякаецца за паўтары гадзіны. Падчас побыту варта наведаць манастыр у Астрогу, Котар, Будву, Бар, Скадарскае возера, з'ездзіць на Мантэнегра-тур. Інфармацыю пра гэтыя мясціны можна знайсці ў інтэрнэце.

Сёлета ў Чарнагорыі адносна мала турыстаў: адчуваецца водгулле крызісу. Аднак цэны ад гэтага не зніжаюцца.

Харчавацца можна ў залежнасці ад сваіх фінансавых магчымасцяў. У забягайлаўках можна набыць частку вялікай піцы за 1—1,5 еўра. У кавярні піца каштуе 4—6 еўра, салаты — 2—3, гарачае — ад 5 еўра. Рыбай пачаставацца — дарагое задавальненне. Радуе, што порцыі вялікія, і не трэба ганяць відэльцам па талерцы ў пошуках ежы.

Мясцовае насельніцтва размаўляе на чарнагорскім дыялекце, пісьмо кірылічнае і лацінскае. Для беларускамоўных мова простая для разумення. Я з першага дня разумела каля 80% з таго, што гавораць. Шмат супольных словаў. Я размаўляла па-беларуску. Мяне разумелі тыя, хто хацеў зразумець. Замовіць ежу ў рэстаране ці купіць што-небудзь у краме — не праблема. У больш развітых турыстычна месцах, такіх як Котар, англійская мова была таксама прымальнай. Расійскамоўных не любяць. Прычым не асабліва адрозніваюць, адкуль яны паходзяць.

Чарнагорыя не ўяўляе небяспекі ў крымінальным плане. Але ёсць іншая праблема — дарогі. Ездзяць як хочуць. Пераходзячы дарогу, трэба быць вельмі ўважлівым. Мясцовыя часта ездзяць п'яныя. Пры невялікім вопыце аўтааматара лепш карыстацца грамадскім транспартам. Акрамя таго, дураць на запраўках. Хітрык просты. Просяць праехаць далей, кіроўца не бачыць, колькі яму наліваюць літраў, — гэта цудоўная магчымасць недаліць.

Яшчэ адна непрыемнасць чакае на пляжы. Усе пішуць — пляжы гальковыя. Гэта не галька, а проста буйныя камяні. У мора ўваходзіць без спецыяльных тапак вельмі цяжка. Можна параніць ногі. Пірсаў няма. Лежакі платныя — ад 2 еўра.

У гарадах і на пляжах шмат кавярняў. Большасць з іх працуе толькі ў турыстычны сезон. У некаторых грае жывая музыка. Дамінуе там свая этнічная ці папулярная, якая вельмі падобная да турэцкай. Часам можна пачуць еўрапейскую. Радуе, што няма расійскай папсы.

Вандраваць па краіне ў спакоі туды цяжка. Шмат фірмаў на вуліцы прапануюць свае паслугі. Цэны адрозніваюцца ў залежнасці ад горада: Астрог — 10—17 еўра, Мантэнегра-тур — 25—35 еўра, Скадарскае возера — 30 еўра. Ад турфірмы я ездзіла ў Астрог наведаць манастыры. Можна браць тур без экскурсавода. Далей вандравала сама. Аўтобусы ходзяць добра. З Бара можна было даехаць да Будвы, Котара і іншых месцаў. Пабыць там я магла столькі, колькі мне было трэба. Гістарычную інфармацыю можна і так знайсці. Экскурсаводы апавядаюць не больш, чым інтэрнэт.

Прывезці з Чарнагорыі можна сувеніры — магніты, кубкі і інш. Але на гэта я грошы не марную. Танна каштуе кава. Калі хочаце смак спадабаецца, то можна прывезці. Іх віно «Вранац» даволі спецыфічнае на смак — кіслае. Белае віно п'юць з мінералкай, а чырвонае — з колай. Найлепшае тут віно — піва. У супермаркетах — выбар віна з суседніх краін, тэкіла, віскі, марціні і інш. Цэны даволі прымальныя.

На маю думку, краіна цікавая і прыгожая, яна кантрастная — мае плюсы і мінусы. Але аднаго разу будзе дастаткова, каб усё пабачыць.

**Наталля Сліж**

ЧАЛАВЕК І ПРЫРОДА

## Ці магчымыя ў Беларусі ўраганы?

У Заходняй Чэхіі ўпершыню зафіксаванае тарнада — слуп-віхор, які мы часта бачым у амерыканскіх навінах. Яго назіралі жыхары вёскі Чыста ля горада Ракоўнік. Ахвяраў няма, віхор мінуў вёску, павыварочваўшы дрэвы ў навакольных лясах.

Тое, што тарнада ўтварыўся ў Еўропе, пацвярджае тэорыю паскарэння працэсу кліматычных змяненняў і глабальнага пацяплення на планеце. Бо тарнада характэрныя для тэрыторый, на якія ўплывае вільготны трапічны клімат. Што іх выклікае — да канца не ясна. Слуп, які нішчыць і ўсмоктвае ўсё, што сустракае на шляху, утвараюць паветраныя масы, якія рухаюцца з рознай хуткасцю на рознай вышыні. Каб разабрацца ў механізме ўтварэння дэтальна, трэба трапіць усярэдзіну слупа. Амерыканскія навукоўцы распрацоўваюць для гэтага спецмашыну, накшталт танка, але дастаткова хуткую, каб дагнаць тарнада. (Хуткасць яго руху — 40—65 км/г.)

У Беларусі таксама некалькі тыдняў трымалася гарачае надвор'е. А зараз да нас ідуць халодныя і вільгатнейшыя масы паветра з Заходняй Еўропы. Сутыкненне з гарачым паветрам можа выклікаць магутныя навальніцы па ўсёй краіне, кажа галоўны сіноптык Белгідраметэацэнтра Вольга Фядутава. «Безумоўна, мы не чакаем грандыёзных ураганаў, якія адбываюцца ў паўднёвых краінах. Аднак і не выключаем такіх прыродных з'яваў нават і ў Беларусі. Будзем адсочваць сітуацыю і адразу ж даваць папярэджанні», — адзначыла В.Фядутава.

Паводле словаў спецыяліста, хуткасць ветра падчас навальніц можа дасягаць 20 м/с. Да ўзроўню штармавога ветра, здольнага здзіраць стрэхі, не хапае ўсяго 0,7 м/с. А ўраганным лічыцца вецер ад 32,6 м/с.

**АП**

КОЛЫ

## Транзітныя нумары новага ўзору ўводзяцца ў Беларусі

Новы ўзор транзітнага рэгістрацыйнага знака для транспартных сродкаў уводзіцца ў Беларусі. Візуальна ён адрозніваецца ад старога. Ён выконваецца з папяровага матэрыялу, які затым ламінуецца. На знаку прастаўляецца нумар рэгіёна і літарна-лічбавае абазначэнне — чорнае на белым тле. Як і на старых нумарах, на ім ёсць літара «Т», толькі яна цяпер стала крыху меншай.

**БЕЛТА**

**Сапраўдная беларуская кухня**

### Зразы (a la Nelson) з паляндвіцы

1,5 кг ялавічыны, 2—3 вялікіх лыжкі масла, 2—3 цыбулі, 400 г хлеба, соль, 8—9 сушаных грыбкоў, 1,5 л бульбы.

З ялавічнай паляндвіцы нарэзаць зразы, адбіць, пасаліць і пакінуць на некалькі гадзінаў. Намазаць спод рондля тоўстым слоем масла, насыпаць туды сечанай цыбулі і цертага хлеба, пакласці радок зразаў, зноў пакласці масла, насыпаць цыбулі, хлеба і яшчэ сушаных грыбкоў. Так радамі запоўніць рондаль. Зверху павінна быць многа масла і трохі хлеба і цыбулі.

Тушыць на маленькім агні пад накрыўкай, час ад часу трэсці рондаль, каб ежа не прыставала да сценак і споду; для лепшага тушэння можна перакласці зразы са споду наверх і наадварот.

Калі зразы будуць гатовыя, выкласці на талерку, гарніруючы смажанай бульбай.

**З кнігі Вінцэнты Завадскай «Літоўская кухарка», 1854**
**Падрыхтавала НБ**

**Прыватныя абвесткі**

**КНІГІ**

**Прадам альманах «Тэксты»** за 2004, 2007, 2008 г. Т.: (029) 332–69–56. Святлана

**Прадаю Біблію** за 5000 рублёў. Т.: (0212) 25–80–79

**СЯБРОЎСКАЕ ПАДАРОЖЖА**

**Запрашаем** у сяброўскае падарожжа 15 жніўня па маршруце: Мінск—Рагачоў—Доўск—Прапойск—Лясная—Быхаў—Грудзінаўка—Вейна—Мінск. Т.: 262–73–43, (029) 111–73–32

**Прыватныя абвесткі ў «НН»** (не больш за 15 словаў) можна падаць бясплатна. Дасылайце поштай (а/с 537, 220050, Мінск) ці праз e-mail (nn@nn.by) або размяшчайце на форуме сайта www.nn.by. Дык скарыстайцеся!

## Кемікі



1) Ляцелі вераб'і, а перад імі стаялі тычкі. Калі на кожную тычку сядзе па вераб'і, то не хопіць адной тычкі. Калі ж на кожную тычку сядзе па два вераб'і, то адна тычка застанецца лішняй. Колькі ляцела вераб'ёў і колькі было тычак?

2) Ляцелі сарока і за ёю сорак. Колькі птушак ляцела?

3) Калі ў насякомага адкінуць першую літару, атрымаецца назва марской жывёліны. Пра якое насякомае ідзе гаворка?

**Сабрала Валянціна Карнялюк.**
**Адказы глядзі на старонцы 16.**

# Памяці герояў

25 ліпеня ў Лідскім раёне адбылося ўшанаванне памяці паўстанцаў, палеглых у сутычцы з расійскімі войскамі ў 1863 годзе.

У полі ля вёскі Малое Ольжава, за 12 км ад Ліды, на былым месцы бою з царскімі войскамі запалілі знічкі ды ўсклалі кветкі. Ксёндз Рычард з Белагруды адслужыў імшу. Кіраўнік лідскай суполкі ТБМ Станіслаў Суднік нагадаў прысутным пра тагачасныя падзеі і трагічны лёс паўстанцаў.

У 1863 годзе Лідскі павет паўстаў адным з першых. Супраць паўстанцаў неўзабаве былі накіраваныя царскія войскі.

На полі спачываюць рэшткі атрада Людвіка Нарбута, які адступаў цераз Нёман. Колькасць палеглых невядомая — адмысловыя раскопкі не вяліся.

Атрад Нарбута быў нешматлікім, але пад ягоным кіраўніцтвам ваявалі Францішак Багушэвіч, Міхал Андрыёлі, які пазней стварыў у Італіі карціну «Смерць Людвіка Нарбута».

Жалобнае мерапрыемства на памятным месцы ўпершыню было праведзена ў 1995 г. Традыцыйная імпрэза штогод ладзіцца ў апошнюю нядзелю ліпеня, перад угодкамі абвяшчэння Дэкларацыі аб суверэнітэце 27 ліпеня 1990.

Першы каменны помнік на полі бою ўсталяваны адразу ў 1863 г. Цяпер на полі стаяць два драўляныя крыжы, усталяваныя ў 1995-м. На іх выбітыя надпісы «Змагарам за незалежнасць».

**Юльян Місюкевіч**






**Пачаўся перыяд зорных дажджоў. 17 ліпеня яго адкрыў метэорны паток Персеіды. Ён будзе бачны да 24 жніўня. За гадзіну на бясхмарным небе налічыш да 100 яркіх метэораў. Таксама ад 21 ліпеня да 30 жніўня назіраецца яшчэ адзін зоркапад — дэльта-Акварыды. Ён прынясе на Зямлю да 20 метэораў за гадзіну. Самымі зорнымі будуць ночы 30 ліпеня (максімум дэльта-Акварыд) і 12–13 жніўня (пік Персеід).**




**У Мінску прайшло свята пажарнікаў — дзецям на пацеху.**




**Так маглі выглядаць байкеры 100 гадоў таму. Выходнымі ў Мінску прайшло байк-шоу-2010.**

## Анекдоты

* * *

Ці думалі мы, што будзем нецярпліва чакаць адпачынку, каб паехаць у халодныя краіны?!

* * *

Пацыентка пытаецца ў стаматолага:

— Доктар, а рваць зубы вельмі балюча?

— Ды не! Я іх вырваў тысячы паўтары і не скрывіўся ні разу.

* * *

Дрывасек пабудаваў дом, выхаваў сына, і толькі з дрэвам выйшла неяк наадварот... А пракурор выхаваў дрэва і пасадзіў сына, а пасля моцна задумаўся: ці не паблытаў ён чаго?

* * *

На дыскатэцы хлопец праводзіць дзяўчыну пасля танца:

— Дзякуй! Сваімі рухамі вы прынеслі мне вялікае задавальненне!

— Ну што вы! Я дрэнна танчу.

— Затое смешна.

* * *

Ленін у маўзалеі ад нуды ноччу разгадвае крыжаванкі. Пытанне 3 па вертыкалі: рэвалюцыянерка, палюбоўніца брата свайго мужа, а таксама В.Ульянава, Бархатава... Першая літара А, апошняя Д. Ільіч сапе незадаволена, упісваючы прозвішча: «Ну, Інка, ну, зараза...»

## «НН» сто гадоў з вамі

**Альковічы Вілейскага пав.** Тут ёсць касцёл і 5—6 хат. 2 ліпня штогод бывае тут кірмаш. І, як вядзецца, бывае па вушы выпіўкі і буянства. Сёлета таксама былі бойкі на кірмашы, а 6 маладцоў напалі па дарозе неякага Міхейчыка з в.Стайкі і забілі яго, ды яшчэ знушчаліся з мёртвага. Убійцаў злавілі і арыштавалі.

**«НН». №29. 1910**

**Знік аператар ОРТ Зміцер Завадскі,** які апошнімі часамі шмат працаваў у Расіі. Зусім малады, ён ужо спазнаў усе выгоды журналісцкай прафесіі: сядзеў у турме за кампанію з Шараметам, здымаў у Чачэніі. Знікненне ў галоўным аэрапорце краіны сярод белага дня — удвая таямнічае. Шарамет вінаваціць Лукашэнку, Замяталін — апазіцыю. Калі гэта пачатак прэзідэнцкай кампаніі, дык брудная ж кампанія намячаецца. Гэтае знікненне моцна псуе вобраз нашай краіны за мяжою.

**«НН». №28. 2000**

**Адказы да старонкі 15:**

1) 4 вераб'і і 3 тычкі. 2) Дзве. 3) Камар, амар.

**Наша Ніва**

незалежная газета

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
шэф-рэдактар — Андрэй Дынько
галоўны рэдактар — Андрэй Генадзевіч Скурко
заснавальнік — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»
выдавец — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Мінск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА.** Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.
12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/0494179 ад 03.04.2009. Пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск. Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных абвестак. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №248 ад 22 чэрвеня 2009 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Мінск, вул. Асаналіева, 15–128. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Мінск, код 764.

**Наклад 6360.** **Газета выдаецца 48 разоў на год.**
Нумар падпісаны ў друк 23.00 27.07.2010.
Замова № 3631.
Рэдакцыйны адрас: Асаналіева 15–128.
Цана дамоўная.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
ISSN 1819-1614
9 771819 161008 10028